Іх працай быў здзіўлены нават Пётр Клімук. Ён казаў пасля, што ўпершыню бачыў, каб каровы ішлі на дойку шэрагамі і пад музыку.

СТАР. 3

У выдавецкім доме «Звязда» будзе зроблена першая спроба абагульніць біяграфіі георгіеўскіх кавалераў — ураджэнцаў беларускіх зямель.

СТАР. 4

У Віцебску плануюць паставіць помнікі кіеўскай княгіні Вользе, князю віцебскаму, вялікаму князю літоўскаму і рускаму Альгерду і славутаму рускаму князю Аляксандру Неўскаму.

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 124 (27489) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЛІЧЫЦЬ ГРОШЫ І ВЫРАБЛЯЦЬ АПТЫМАЛЬНУЮ ТЭХНІКУ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даручыў забяспечыць аграрыяў усёй неабходнай якаснай корманарыхтоўчай тэхнікай. Адпаведнае даручэнне кіраўнік дзяржавы даў, наведваючы з рабочай паездкай Шклоўскі раён Магілёўскай вобласці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

У ААТ «Александрыйскае» Прэзідэнт азнаёміўся з сучаснымі тэхналогіямі, айчыннымі і замежнымі комплексамі машын для нарыхтоўкі травяных кармоў. «За гэты сезон мы павінны вызначыцца, і, вядома ж, пажадана выпускаць усю гаму неабходнай тэхнікі. Мы павінны нарыхтаваць якасныя кармы. Якім чынам — гэта справа практыкаў, але мы ім павінны прапанаваць рацыянальны эканамічны варыянт. Трэба грошы лічыць і вырабляць аптымальную, рацыянальную і эканамічную тэхніку», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што на першым месцы ў любым выпадку павінна быць якасць выпускаемай тэхнікі: «Цяп-ляп нам не трэба». Ад міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леаніда Зайца Прэзідэнт запатрабаваў самым прынцыповым чынам падыходзіць да гэтага пытання і ні ў якім выпадку не набываць для гаспадарак сумніўную ў плане якасці тэхніку.

Леанід Заяц растлумачыў, што з-за працяглай зімы ўраджайнасць азімых месцамі будзе ніжэйшай, чым чакалася, у той жа час стан яравых пасеваў даволі добры. «Гэта значыць 9 млн.т з кукурузай вы атрымаеце?» — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка. Леанід Заяц пацвердзіў, што гэты ўзровень павінен быць дасягнуты.

Асобныя даручэнні Прэзідэнт даў адносна неабходнасці якаснай і своечасовай уборкі рапсу. Ураджайнасць гэтай культуры ў бягучым годзе значна перавышае мінулагоднія паказчыкі.

СВЕТЛАЕ СВЯТА ЛЮБОВІ

Фота БЕЛТА.

Свята «Купалле» і сама рака Днепр, на беразе якой яно праходзіць, аб'ядноўваюць тры славянскія народы — Беларусі, Расіі і Украіны. Аб гэтым Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заявіў на свяце, якое мае назву «Александрыя збірае сяброў».

«Я сказаў бы, што гэта тыдзень нашага славянства, славянскага духу — тое, што нас аб'ядноўвае. Сімвалічна, што гэта пачынаецца тут, на беразе Дняпра, і прадоўжыцца праз некалькі дзён у цэнтры Еўропы, у нашым прыгожым і добрым горадзе Віцебску на «Славянскім базары». Гэта сведчыць аб тым, што мы ў свой час правільна вырашылі ў гэтыя святочныя дні збірацца тут», — сказаў Прэзідэнт. Прэзідэнт падкрэсліў, што Купалле — вельмі светлае і добрае свята любові і надзей на гэту любоў. Ён пажадаў людзям не страчваць надзею і заўсёды дабівацца сваіх вялікіх і маленькіх мэт.

Для ўдзельнікаў і гасцей была прадугледжана шырокая забаўляльная і культурная праграма. На святочнай пляцоўцы праходзіў «Александрыйскі кірмаш», дзе можна было набыць вырабы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, сувеніры з сімволікай свята і работы народных майстроў. У праграме мерапрыемства таксама майстар-класы ўдзельнікаў міжнароднага пленэру па кераміцы «Арт-жыжаль», прэзентацыі-дэгустацыі прадукцыі перапрацоўчай прамысловасці, гульнявая праграма «Купальскі карагод», выступленні творчых калектываў мастацкай самадзейнасці, забаўляльная танцавальная праграма для моладзі, тэатралізаваная абрадавая праграма «Чараўніцтва купальскай ночы», выстаўка «Археалагічныя знаходкі Верхняга Падняпроўя», фестываль беларускага лёну, свята піва і многае іншае.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:

«Беларусь правяла аптымізацыю сваіх замежных установ у адпаведнасці са знешнеэканамічнымі прыярытэтамі. Наша краіна не адмаўляецца ад сваіх традыцыйных рынкаў. Гэта і Расія, і краіны Еўрапейскага саюза, з якімі актыўна развіваецца знешнеэканамічная дзейнасць. Але, з улікам сусветнай фінансава-эканамічнай сітуацыі, якая складваецца апошнім часам, мы бачым неабходнасць пашыраць сваю прысутнасць на тых рынках, дзе раней не працавалі. А гэта рынкі Паўднёва-Усходняй Азіі, Лацінскай Амерыкі, Афрыкі. Выходзячы з такога падыходу да перспектыў нашага знешнеэканамічнага развіцця мы правялі і аптымізацыю нашых замежных устаноў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 9.07.2013 г.

Долар ЗША	8840,00	■
Еўра	11350,00	▼
Рас. руб.	265,50	▼
Укр. грыўня	1083,67	▲

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 24°
Віцебск	+ 25°
Гомель	+ 29°
Гродна	+ 23°
Магілёў	+ 25°
Мінск	+ 24°

ЦЁПЛА, З ДАЖДЖАМІ

«Самымі дажджлівымі днямі на тыдні будуць пятніца і субота, калі праз Беларусь будзе праходзіць атмасферны фронт з паўночнага захаду Еўропы», — паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый Рабаў.

У сераду, 10 ліпеня, пераважна без ападкаў, днём у асобных раёнах — кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. У начы плюс 8-15 градусаў, днём — ад 21 да 28 вышэй за нуль.

У чацвер, 11 ліпеня, месцамі будуць ісці кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Уначы плюс 10-17, у дзень 20-27 са знакам плюс, па паўднёвым усходзе краіны 29 градусаў.

У пятніцу і суботу, 12-13 ліпеня, кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. У начныя гадзіны прагназуецца плюс 12-19, днём чакаецца 18-24 вышэй за нуль, ва ўсходніх раёнах — да плюс 27.

У нядзелю, 14 ліпеня, у сувязі з ростам атмасфернага ціску на большай частцы тэрыторыі рэспублікі спыняцца дажджы. Уначы будзе плюс 10-17 градусаў, у дзённыя гадзіны — ад 20 да 27 вышэй за нуль.

■ «Круглы стол» «Звязды»

ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА: памяць павінна жыць

Набліжаецца юбілей трагічнай падзеі... 28 ліпеня 2014 года спаўняецца 100 гадоў з пачатку аднаго з самых кровапралітных і маштабных узброеных канфліктаў у гісторыі чалавецтва — Першай сусветнай вайны.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Вялікая вайна стала шматнацыянальным горам: у ёй удзельнічалі 38 краін з 59 існуючых на той час незалежных дзяржаў. У выніку перасталі існаваць 4 імперыі: Расійская, Аўстра-Венгерская, Асманская і Германская. Загінула каля 10 мільёнаў вайскоўцаў, яшчэ больш мірных жыхароў.

Так склалася, што мы быццам бы выкраслілі са сваёй памяці гэтыя падзеі, гэтыя лічбы, гэтых людзей... Бо ўсё часцей узгадвалі наступствы самай апошняй вайны — Вялікай Айчыннай. А так быць не павінна. Бо Беларусь была ў эпіцэнтры тых баёў, лінія фронту доўгі час праходзіла на нашай зямлі.

Так думаюць гісторыкі, даследчыкі і проста неабыякавыя да гэтай тэмы людзі, якія сабраліся падчас пасяджэння «круглага стала» газеты «Звязда» і аналітычнага цэнтра EcooM. Узгадалі трагічныя падзеі той вайны, абмеркавалі пытанні захавання гістарычнай памяці, адкрылі малавядомыя старонкі гісторыі...

СТАР. 4

■ Соцыум

ДЗІЦЯЧЫЯ ДАПАМОГІ: НОВЫ ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ І ВЫПЛАТЫ

У нашай краіне зацверджана новая рэдакцыя Палажэння аб парадку прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей. Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе беларускага ўрада, такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 28 чэрвеня 2013 года № 569.

У Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны тлумачаць, што новая рэдакцыя дакумента падрыхтавана ў сувязі са змяненнем падыходаў да прызначэння дапамог і неабходнасцю іх комплекснага рэгулявання з улікам нормаў Закона Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 2012 года «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей».

Згодна з Палажэннем, заява аб прызначэнні дзяржаўных дапамог падаецца грамадзянамі асабіста. Тэрмін накіравання дзяржорганамі, іншымі арганізацыямі запытаў для атрымання дакументаў або звестак, неабходных для назначэння і выплаты дапамог, павялічваецца з трох да пяці каляндарных дзён з дня паступлення заявы.

У Палажэнні ўдакладняюцца месцы прызначэння дзяржаўдапамог. Вызначаюцца выпадкі, пры якіх сям'я разглядаецца як няпоўная, і дакументы, якія пацвярджаюць катэгорыю няпоўнай сям'і.

Канкрэтызуюцца дні выплаты дапамог, прызначаных па месцы працы (службы), вучобы, праходжання падрыхтоўкі ў клінічнай ардынатуры.

Жанчынам, якія сумяшчаюць навучанне з працай, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца і выплачваецца па месцы вучобы і па месцы працы.

СТАР. 2

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СК РФ ЗАВЁЎ СПРАВУ АБ КРУШЭННІ ЦЯГНІКА НА КУБАНІ

7 ліпеня каля 17:00 на перагоне Кіслякоўская — Крылоўская на Кубані сышоў з рэек цягнік, які рухаўся з Новасібірска ў Адлер. У цягніку знаходзіліся больш за 600 пасажыраў. З рэек сышло 11 вагонаў. Пяць з іх упалі на чыгуначныя пуці. У выніку крушэння ніхто не загінуў. Пацярпела больш за 90 чалавек. 15 пасажыраў былі шпіталізаваны, у тым ліку пяцёра дзяцей. Іх стан медыкі называюць стабільным. Пасажыры цягніка, які сышоў з рэек, дабраліся да месца прызначэння прыкладна ў 11:00 8 ліпеня. Іх даставілі спецсаставам. Следчы камітэт РФ завёў крымінальную справу аб крушэнні пасажырскага цягніка па артыкуле 263 КК РФ («Парушэнне правіл бяспекі руху і эксплуатацыі чыгуначнага транспарту»). Аб падазраваных не паведамляецца.

АФРЫКАНСКІЯ ДЗЕЦІ ЎСТАНАВІЛІ РЭКОРД ПА СІНХРОННАЙ ЧЫСТЦЫ ЗУБОЎ

У мерапрыемстве прынялі ўдзел больш за 300 тысяч навучэнцаў прыкладна 300 нігерыйскіх школ. Акцыя была праведзена па ініцыятыве асацыяцыі стаматолагаў, якія вырашылі навучыць дзяцей правільна даглядаць зубы і поласць рота. Нігерыйскія дзеці пабілі папярэдні рэкорд масавай чысткі зубоў, устаноўлены ў 2007 годзе ў Індыі. Тады ў рэкорднай чыстцы прынялі ўдзел 117 003 чалавекі. Пакуль афрыканскае дасягненне не было ўключана ў Кнігу рэкордаў Гінеса.

КАМПАНІЯ ІНДАНЕЗІЙЦАЎ ТРЫ ДНІ ПРАСЯДЗЕЛА НА ДРЭВЕ З-ЗА ТЫГРАЎ

Шэсць мужчын выпадкова забілі тыграня, якое трапіла ў пастаўлены імі капкан на аленя. Гэта і стала прычынай нападу на іх адразу чатырох тыграў. Драпежнікі разарвалі аднаго з мужчын, а астатніх загналі на дрэва і пільнавалі ўсе тры дні. У выратавальнай аперацыі ўдзельнічалі каля 30 чалавек. Ратавальнікаў выклікалі знаёмыя пацярпелых, з якімі тыя звязаліся па тэлефоне. Пошукі мужчын занялі некалькі дзён, паколькі плошча нацыянальнага парку, у якім адбыўся інцыдэнт, перавышае сем тысяч квадратных кіламетраў. Выратавальнікі здолелі адагнаць тыграў ад дрэва, і мужчыны нарэшце змаглі спусціцца на зямлю. Нацыянальны парк Гунунг-Лэсер славіцца вялікай колькасцю тыграў і іншых драпежнікаў. Тым не менш жыхары навакольных вёсак ўсё роўна рэгулярна ходзяць туды па альясавыя дрэвы, якія з'яўляюцца для іх галоўнай крыніцай прыбытку. Так, за адзін кілаграм такой драўніны можна атрымаць каля 500 долараў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ПРЫСУД БЫЛОМУ МІНІСТРУ — СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ

Экс-міністр чыгунак КНР абвінавачваўся ў карупцыі і злоўжыванні службовымі паўнамоцтвамі. Лю Чжыцзюнь асуджаны на смяротнае пакаранне з адтэрміноўкай прысуду. Па версіі следства, займаючы пасаду міністра, ён браў хабар за размеркаванне дзяржкантракта на будаўніцтва чыгунак. Лю Чжыцзюнь заняў пасаду міністра чыгунак у 2003 годзе. У 2011 годзе стала вядома пра яго адстаўку, прычыны якой ніяк не каментаваліся. Знаходзячыся на пасадзе міністра, Лю Чжыцзюнь на працягу некалькіх гадоў паспяхова супраціўляўся расфарміраванню ўзначаленага ім ведамства. Аднак у сакавіку 2013 года было абвешчана аб ліквідацыі міністэрства чыгунак Кітая. У большасці выпадкаў у Кітаі смяротнае пакаранне з адтэрміноўкай прысуду пасля замяняецца на пажыццёвае зняволенне.

КАРОТКА

Аграрыі чатырох абласцей Беларусі пачалі ўборку азімага рапсу. Гэту культуру ўбіраюць на палях Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей.

Сярэдні ўзрост насельніцтва Беларусі — 39,8 года, прычым сярэдні ўзрост мужчыны — 37 гадоў, жанчыны — 42,2 года. Для параўнання: сярэдні ўзрост жыхароў планеты складае — 29 гадоў, Еўропы — 39,9 года.

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка займае 3-е месца ў рэйтынгу ВТА. У параўнанні з мінулым спісам яна страціла адну пазіцыю, прапусціўшы на другое месца расіянку Марыю Шарапаву, а на першай пазіцыі па-ранейшаму амерыканка Серэна Уільямс.

Стацыянарныя камеры фотафіксацыі пачнуць працаваць у пяці найбольш аварыйна-небяспечных участках на Мінскай кальцавой дарозе з 9 ліпеня. Гэта 0-ы, 10-ы, 2-і, 24-ы і 39-ы кіламетры МКАД.

■ Прыёмная кампанія-2013

ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ НАСТАЕ «МОМАНТ ІСЦІНЫ»

Расійская федэральная служба па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі агучыла колькасць школьнікаў, якія не змаглі набраць на адзіным дзяржаўным экзамене мінімальную колькасць балаў. Так, на АДЭ па матэматыцы не пераадолелі вызначаную мінімальную мяжу 9,6% выпускнікоў школ (летась, дарэчы, такіх нешчасліўцаў было 4,5%). З фізікай не справіліся 8,7% выпускнікоў, з біялогіяй — 6,4%, з хіміяй — 5,7%. Але горш за іншыя дысцыпліны расійскія школьнікі здалі геаграфію, дзе за мяжой мінімальнага бала аказаліся ажно 12% выпускнікоў. Тыя, хто атрымаў «двойкі» па абавязковых прадметах, засталіся сёлета без атэстатаў.

Сёння ў нашых суседзяў разгарэлася дыскусія наконт таго, як папярэдзіць у будучыні шматлікія парушэнні пры правядзенні АДЭ. Прычым прапановы выказваюцца самыя розныя. Напрыклад, ёсць і нечаканыя, накшталт «забараніць школьнікам выходзіць у прыбіральню падчас здачы экзамену, каб папярэдзіць спісванне» або «ўстанаўліваць вэб-камеры ў экзаменацыйных аўдыторыях з перадачай трансляцыі ў інтэрнэт». Не першы год гучаць прапановы выкарыстоўваць глушылынікі сотавай сувязі, каб абітурыенты не маглі «выйсці на сувязь» з экзаменацыйнай аўдыторыі. Некаторыя эксперты выказваюцца за поўную ізаляцыю стваральнікаў заданняў да адзінага дзяржаўнага экзамену на ўвесь час правядзення тэстаў. Ёсць і больш канструктыўныя прапановы — па стварэнні незалежных цэнтраў правядзення адзінага дзяржаўнага экзамену і размеркаванні кантрольна-вымяральных матэрыялаў не па рэгіёнах, як гэта адбываецца зараз, а па часавых паясах, або па правядзенні адзінага дзяржаўнага экзамену адначасова на ўсёй тэрыторыі Расіі. Дапусцім, школьнікі ў Маскве будуць пісаць экзамен раніцай, а на Далёкім Усходзе — увечары і гэтак далей.

Рэпетытар — яшчэ не гарантыя

У адрозненне ад Расіі, дзе адзіны дзяржаўны экзамен штогод суправаджаюць гучныя скандалы, у нашай краіне падчас прыёмнай кампаніі на хвалі інтарэсу аказваюцца, як правіла, зусім іншыя пытанні. Напрыклад, сёлета ў цэнтры ўсеагульнай увагі аказаліся дастаткова нізкія вынікі ўдзельнікаў тэсціравання па матэматыцы і фізіцы. А паколькі арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання ўжо не першы год адмаўляюцца агучваць сярэднія балы ўдзельнікаў ЦТ, то застаецца абмяркоўваць вялікую колькасць абітурыентаў, якія аказаліся за мяжой мінімальнага бала, што дазваляў удзельнічаць у конкурсным адборы ў ВНУ.

СТАР. 2

ДЗІЦЯЧЫЯ ДАПАМОГІ: НОВЫ ПАРАДАК ПРЫЗНАЧЭННЯ І ВЫПЛАТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Палажэннем вызначаецца парадак прызначэння і выплаты дапамог тым, хто працуе ў камерцыйных арганізацыях.

Вызначаецца парадак прызначэння і выплаты дапамогі жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржарганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці. Гэтая дапамога прызначаецца на падставе заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі. Удакладняецца, што памер гэтай дапамогі не залежыць ад колькасці народжаных дзяцей.

У Палажэнні ўдакладняецца, што ў выпадку ўстанаўлення інваліднасці днём узнікнення права на дзярждапамогі з'яўляецца не толькі дзень першаснага агляду грамадзяніна МРЭК, але і дзень яго чарговага перагляду.

У артыкуле 5 вызначаны парадак прызначэння і выплаты дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Удакладняецца сістэма ўліку дзяцей пры вызначэнні дыферэнцаванага памеру дапамогі. Рэгулюецца парадак перагляду памеру дапамогі пры змяненні складу сям'і да дасягнення малодшым дзіцем узросту 3 гадоў. Удакладняюцца асаблівасці выплаты дапамогі ў выпадку занятасці асобы, якая ажыццяўляе догляд дзіцяці.

Вызначаецца парадак прызначэння дапамогі ў памеры 150% ад установленага памеру грамадзянам, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання.

Прызначэнне і выплата дапамогі на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў рэгулюецца артыкулам 6. Удакладнены дзень узнікнення права на дапамогу ў выпадку змянення складу або катэгорыі сям'і, вызначаны парадак уліку ў складзе сям'і дзяцей, якія знаходзяцца пад апекай, а таксама парадак вызначэння катэгорыі сям'і ў выпадку ўстанаўлення апекі (папячыцельства).

У главе 8 вызначаны прычыны прызначэння і выплаты дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў. Для таго, каб выключыць неабгрунтаванае прызначэнне дапамогі, уводзіцца патрабаванне аб сумесным фактычным пражыванні альбо пражыванні ў адным населеным пункце дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў і асобы, якая ажыццяўляе яго догляд. Устанаўліваецца прыярытэтнае права на прызначэнне дапамогі маці (мачысе) у выпадках, калі бацькі абое не з'яўляюцца занятымі. Разам з тым пры наяўнасці аб'ектыўных прычын, па якіх маці (мачыха) не можа ажыццяўляць догляд дзіцяці, дапамога прызначаецца бацьку (айчыму). Аб'ектыўнасць такіх прычын высвятляе камісія па прызначэнні дапамог органа па працы, занятасці і сацабароне.

Вызначаны і абставіны аднаўлення выплаты дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў пры яго выбыцці з дзіцячых інтэрнатных устаноў, устаноў адукацыі з кругласутачным рэжымам знаходжання ў сям'ю на тэрмін звыш аднаго месяца або змене рэжыму знаходжання дзіцяці-інваліда ў такіх установах.

Святлана БУСЬКО.

У МІНСК ПРЫБЫВАЕ СВЯТЫНЯ

У Мінск будзе дастаўлены крыж, на якім, паводле падання, прыняў пакутніцкую смерць святы апостал Андрэй Першазваны. Па рашэнні праведзенага пасяджэння Сінода Беларускага Экзархата святыня будзе знаходзіцца з 29 ліпеня па 2 жніўня ў храме ў гонар апостала Андрэя Першазванага і храме-помніку ў гонар Усіх Святых, паведамілі БЕЛТА ў Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы.

Крыж, на якім быў распяты апостал Андрэй, захоўваецца ў саборы горада Патры на паўвостраве Пелапанес (Грэцыя). Святыня пабывае ў Санкт-Пецярбургу, Маскве, Кіеве, а затым у Мінску. «Падзея прызначана нагадаць, што духоўнае жыццё народаў трох дзяржаў узыходзіць да адзінай крыніцы — благаславення, дадзенага апосталам Андрэем у I стагоддзі ад Ражджаства Хрыстовага, і да Хрышчэння, прынятага ў Кіеўскай купелі ў 988 годзе», — адзначылі ў БПЦ.

САПРАЎДНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Уручаны ўзнагароды пераможцам конкурсу «Моцная сям'я — моцная дзяржава»

Сям'я і дзяржаўнасць заўсёды былі традыцыйнымі беларускімі каштоўнасцямі. Пра гэта заявіла 8 ліпеня першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч на цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў рэспубліканскага творчага конкурсу сярод друкаваных і электронных сродкаў масавай інфармацыі «Моцная сям'я — моцная дзяржава». На здымку: адзін з пераможцаў рэдактар аддзела сацыяльных праблем газеты «Звязда» Надзея ДРЫЛА.

Фота БЕЛТА.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ ПА ПЕНСІІ? ТЭЛЕФАНУЙЦЕ!

У сераду, **10 ліпеня, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валерый Валер'евіч КАВАЛЬКОЎ** правядзе прамую тэлефонную лінію на тэму: «Пытанні пенсійнага забеспячэння».

У гэты дзень **з 11.00 да 12.00** па тэлефоне **(017) 306-37-95** любы грамадзянін краіны зможа задаць пытанне намесніку міністра, падзяліцца сваёй думкай, выказаць свае прапановы па актуальных пытаннях.

ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ НАСТАЕ «МОМАНТ ІСЦІНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Інфармацыя пра сярэдні бал цэнтралізаванага тэсціравання прызначана для службовага выкарыстання. І не таму, што мы хочам нешта прыхаваць, проста гэта інфармацыя мае чыста тэхналагічнае значэнне. Мы свядома не друкуем гэтыя звесткі, бо лічым іх не вельмі інфарматыўнымі. Неспецыялісты (і мы бачым гэта ў абмеркаваннях на сайтах) успрымаюць падобную інфармацыю скажона, спрабуючы рабіць глабальныя высновы пра ўзровень падрыхтоўкі ўсіх абітурыентаў краіны, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.**

Аднак факт застаецца фактам: новы мінімальны парог балаў, зацверджаны Міністэрствам адукацыі, істотна скарачыў колькасць прэтэндэнтаў на вышэйшую адукацыю. Пасля здачы іспытаў па матэматыцы за бортам аказаліся 32,7% яго ўдзельнікаў. А на ЦТ па фізіцы менш як 15 балаў набралі 37% абітурыентаў з 35 763. З нулём балаў на фініш прыйшлі 111 удзельнікаў ЦТ па матэматыцы і 66 удзельнікаў ЦТ па фізіцы. Затое менавіта на фізіцы і матэматыцы была зарэгістравана рэкордная колькасць 100-бальных вынікаў: максімум набралі на ЦТ па матэматыцы аж 146 чалавек і 46 чалавек — па фізіцы. Выходзіць, што тэсты былі не такія ўжо і складаныя, як гэта сцвярджаюць тыя, хто экзамен праваліў. Асабліва крыўдна за невысокія балы тым абітурыентам, хто звяртаўся да паслуг рэпетытараў...

Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца штодня кожныя тры гадзіны: а 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00. Але ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15 гадзіне!

Між іншым, Мікалай Фяськоў катэгарычна нязгодны з думкай, што без рэпетытара стаць студэнтам наогул немагчыма:

— Я абсалютна ўпэўнены, што рэпетытар, няхай і пры самым адказным стаўленні да сваёй справы, за паўгода ці нават за год перыядычных сустрэч з вучнем не можа замяніць 11 гадоў вывучэння матэматыкі, мовы і іншых прадметаў у школе. Крыху ўпарадкаваць атрыманыя ў школе веды, навучыць асобным прыёмам работы ў абставінах, блізкіх да тых, што будуць на экзамене, — так, здолее. А вось цалкам замяніць школу, якая забяспечвае атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, і школьнага настаўніка, які на працягу многіх гадоў вучыць дзіця, — не.

Будзьце аб'ектыўнымі!

У тым, што абітурыенты часта пераболь-шваюць свае магчымасці, ёсць і пэўная віна дарослых: як школьных настаўнікаў, так і бацькоў. Уладальнікі школьных «васьмёрак» і «дзявятак» нярэдка ўпэўнены ў тым, што і на цэнтралізаваным тэсціраванні яны абавязкова атрымаюць высокія балы. Напрыклад, колькі гадоў таму ў Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў паступіла скарга ад абітурыента, у якога ў школьным атэстаце была «васьмёрка» па матэматыцы, але на тэсціраванні ён здолеў набраць толькі 11 балаў па стабальнай шкале. Калі «паднялі» работу гэтага маладога чалавека і зазірнулі ў яго чарнавікі, то пераканаліся, што абітурыент выканаў толькі 5 заданняў часткі А — там, дзе прыводзяцца варыянты адказаў. А за частку В і ўвогуле не браўся.

— Асноўная мэта тэсціравання — ранжыраванне абітурыентаў для супастаўлення іх падрыхтаванасці ў пэўнай галіне ведаў. Пунктам адліку для нас з'яўляецца не абстрактны аб'ём ведаў, зафіксаваны ўмоўным стандартам, а веды аднаго абітурыента ў параўнанні з ведамі іншых, — тлумачыць Мікалай Фяськоў. — Прасцей кажучы, у кожнага прэтэндэнта на студэнцкі білет павінна быць свая прыступка ў агульным рэйтынгу. І ўсе школьныя выдатнікі проста не могуць атрымліваць на тэсціраванні 100-бальныя вынікі.

Зрэшты, у 2008 годзе, калі мінімальную планку на ЦТ паднялі да 20 балаў, а вынікі абітурыентаў аказаліся вельмі «сціплымі», у самы разгар уступнай кампаніі давялося «правілы гульні» змяняць — каб ВНУ увогуле не засталіся без студэнтаў. Затым ніжнюю планку ў Міністэрстве адукацыі вырашылі ўвогуле адмяніць, і падаваць дакументы ў ВНУ змаглі і абітурыенты нават з некалькімі баламі ў сертыфікатах — пры наяўнасці свабодных месцаў прыёмныя камісіі не мелі права адмовіць абітурыентам у залічэнні. Вядома, такая сітуацыя разбэсціла абітурыентаў: навошта вучыцца, напружвацца, калі паступленне ім фактычна гарантавана? Асабліва калі бацькі гатовы тваё навучанне аплачваць. Летась, дарэчы, у бланку адказаў аднаго з абітурыентаў знайшлі фразу наступнага зместу: «Военкомат — страна чудес, зашёл на час — на год исчез». Вельмі красамоўнае сведчанне таго, як некаторыя абітурыенты ставяцца да прыёмнай кампаніі. Аднак такое становішча спраў не задавальняла многія ВНУ, якія былі вымушаны арганізоўваць для першакурснікаў падтрымальныя курсы — каб падцягнуць іх веды да патрабаванняў вышэйшай школы. І ўжо першая сесія расстаўляла ўсё па сваіх месцах...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Тэлефон «гарачай» лініі «Абітурыент-2013» у Міністэрстве адукацыі (017) 222 43 54

Як укамплектуюцца вышэйшыя навучальныя ўстановы сёлета, як укамплектуюцца педагагічныя і інжынерна-тэхнічныя спецыяльнасці, як будуць запаўняцца платныя месцы, даволі цяжка спрагназаваць. Колькасць абітурыентаў ужо істотна зменшылася. Пасля тэсціравання па матэматыцы з прыёмнай кампаніі выбыў кожны трэці ўдзельнік ЦТ, яшчэ больш абітурыентаў не вытрымалі іспытаў па фізіцы... У адным можна дакладна не сумнявацца — якасны склад першакурснікаў сёлета значна палепшыцца. І калі ў Міністэрстве адукацыі прымалі рашэнне аб павышэнні мінімальнай планкі на ЦТ, напэўна, менавіта да гэтага і імкнуліся?

У адным можна дакладна не сумнявацца — якасны склад першакурснікаў сёлета значна палепшыцца. І калі ў Міністэрстве адукацыі прымалі рашэнне аб павышэнні мінімальнай планкі на ЦТ, напэўна, менавіта да гэтага і імкнуліся?

Графік прыёмных камісій

9 ліпеня распачаўся прыём дакументаў у ВНУ «сілавых» ведамстваў і творчых ВНУ. Першымі па традыцыі прыйдуць у прыёмныя камісіі абітурыенты Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, Ваеннай акадэміі, Камандна-інжынернага інстытута, Гомельскага інжынернага інстытута МНС, Акадэміі мастацтваў, Акадэміі музыкі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. Прыёмныя камісіі ВНУ сілавых структур будуць весці прыём дакументаў на ўсе формы навучання з 9 па 15 ліпеня. Падаць свае дакументы ў гэтыя ж ВНУ на завочную і вячэрнюю формы навучання абітурыенты, якія вытрымалі ўступныя іспыты, але не прайшлі на дзённую бюджэтную форму навучання, змогуць па 21 ліпеня, а для ўдзелу ў конкурсе на дзённую завочную і вячэрнюю формы атрымання адукацыі на ўмовах аплаты дакументы будуць прымацца па 23 ліпеня.

У так званых творчых ВНУ прыём дакументаў на ўсе формы навучання будзе весціся з 9 па 13 ліпеня. Для абітурыентаў, якія не прайшлі па конкурсе на дзённую бюджэтную форму навучання, дакументы на завочную або вячэрнюю формы навучання будуць прымацца па 25 ліпеня, а на платную форму навучання — па 27 ліпеня. Ва ўсіх астатніх ВНУ любой формы ўласнасці прыём дакументаў будзе весціся з 16 да 25 ліпеня (на ваенных факультэтах — з 16 па 23 ліпеня). У Акадэміі МУС, Ваеннай акадэміі, Камандна-інжынерным інстытуце МНС, Гомельскім інжынерным інстытуце МНС уступныя іспыты пройдуць з 16 па 19 ліпеня, у творчых ВНУ — з 14 па 23 ліпеня, у ВНУ другога патоку (як дзяржаўных, так і прыватных) — з 26 па 30 ліпеня. Залічэнне абітурыентаў у ВНУ «сілавых» ведамстваў на ўсе формы навучання завершыцца 24 ліпеня, у творчых ВНУ — 28 ліпеня, а ў ВНУ другога патоку — 6 жніўня.

Што да рэжыму работы прыёмных камісій, у вызначаныя правіламі прыёму тэрміны прыёмныя камісіі будуць працаваць з панядзелка па суботу з 9.00 да 18.00. А калі апошні дзень прыёму дакументаў, здачы ўступных іспытаў ці залічэння абітурыентаў прыпадзе на нядзелю, прыёмная камісія будзе працаваць таксама і ў гэты дзень з 9 раніцы да 18 гадзін.

Такім чынам, сёлета прыёмныя камісіі ВНУ Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства абароны і Пагранкамітэта будуць працаваць па суботах 13 і 20 ліпеня і ў нядзелю 21 ліпеня.

Прыёмныя камісіі ВНУ Міністэрства культуры будуць працаваць па суботах 13, 20 і 27 ліпеня, а таксама дзве нядзелі — 14 і 21 ліпеня (у выпадку правядзення ў гэтыя дні ўступных іспытаў па творчасці).

Прыёмныя камісіі ВНУ другога патоку будуць працаваць па суботах 20, 27 ліпеня, 3 жніўня і ў нядзелю 4 жніўня (апошні дзень прыёму дакументаў на платнай аснове).

Многіх абітурыентаў часта цікавіць, якім чынам арганізуецца асобны конкурс для сельскай моладзі. Усё даволі проста: месцы вызначаны кантрольнымі лічбамі прыёму (без уліку лічбаў прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі). Залічваюцца асобы, якія маюць ільготы на залічэнне без уступных іспытаў і па-за конкурсам. А тыя месцы, што засталіся, дзеляцца прапарцыянальна пададзеным заявам сярод дзвюх катэгорый абітурыентаў — сельскіх і гарадскіх. Між іншым, не пашкодзіць нагадаць, што залічэнне па асобных конкурсах сярод абітурыентаў-гараджан і абітурыентаў з сельскай мясцовасці можа ажыццяўляцца толькі на бюджэтныя месцы. А пры залічэнні на ўмовах аплаты дзейнічае агульны конкурс, без раздзялення выпускнікоў на сельскіх і гарадскіх.

Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца штодня кожныя тры гадзіны: а 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00. Але ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца а 15 гадзіне! У абітурыентаў будзе ўсяго тры гадзіны, каб канчаткова вызначыцца з выбарам ВНУ або спецыяльнасці. У апошні дзень прыёму дакументаў допуск абітурыентаў у будынак навучальнай установы, у якой размешчана прыёмная камісія, спыніцца а 18 гадзіне. У гэты ж час прыёмная камісія таксама спыніць выдачу абітурыентам дакументаў з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць, пры гэтым будзе ажыццяўляцца прыём дакументаў ад усіх абітурыентаў, якія паспелі трапіць у будынак да таго, як дзверы на ўваход зачыніліся.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даведка «Звязды»:

У БДУ ў 2013 годзе адкрыецца адразу 7 новых спецыяльнасцяў, падрыхтоўка па якіх раней у беларускіх ВНУ не вялася: «Гідраметэаралогія», «Космааэракартаграфія», «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі», «Механіка і матэматычнае мадэляванне», «Ядзерныя фізіка і тэхналогіі», «Хімія лекавых злучэнняў» і «Хімія высокіх энергій». Сярод «навінак» прыёмнай кампаніі ў БДУІР — «Эканоміка электроннага бізнесу», «Электронны маркетынг», «Праграмаваныя мабільныя сістэмы» і іншыя. А ў Міжнародным гуманітарным экалагічным універсітэце адкрываецца спецыяльнасць «Медыцынская фізіка». Усяго ў Агульнадзяржаўны класіфікатар «Спецыяльнасці і кваліфікацыі» было ўключана больш як 30 новых спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі першай ступені.

■ У свеце

КАРПАРАЦЫІ КІРУЮЦЬ СМІ?

Цікавы артыкул пра амерыканскія мас-медыя з'явіўся нядаўна на The Huntington Post (амерыканскім анлайн-СМІ). Яго назва «Асвятленне справы Сноўдэна: калі б мас-медыя ЗША знаходзіліся пад дзяржаўным кантролем, ці выглядалі б яны інакш?», адлюстроўвае адну з найбольш хвалюючых сусветную грамадскасць гісторый аб выкрыцці Эдвардам Сноўдэнам фактаў шпіянажу з боку амерыканскага ўрада як за грамадзянамі ЗША, так і за іншаземцамі.

Аўтар артыкула, Джэф Коэн, лічыць, што ўцечка звестак ад Эдварда Сноўдэна прадэманстравала, што амерыканская карпаратыўная медыясістэма знаходзіцца ў стане вайны з незалежнай журналістыкай. Ён адзначае, што многія з тых жа СМІ (асабліва тэлевізійныя навіны), якія прапусцілі крызіс на Уол-стрыт і віталі ўварванне ў Ірак, нагадваюць сродкі масавай інфармацыі, якія кантралююцца дзяржавай, у сваёй амаль поўнай ідэнтыфікацыі з урадам, у тым, як ён праследуе цяпер 30-гадовага выкрывальніка.

У той час як апытанні паказваюць, што палова амерыканскай грамадскасці лічыць, што Сноўдэн зрабіў добрую справу, абнародаваўшы інфармацыю аб шпіянажы Нацыянальнага агенцтва бяспекі, навінавыя праграмы тэлебачання выключаюць гэты пункт гледжання з вяшчання. І хоць тэлевядучыя і госці праграм не з'яўляюцца дзяржаўнымі службоўцамі, у некаторых з іх ёсць схільнасць, кажучы пра ўрад, выкарыстоўваць займеннік «мы». Джэф Коэн пакеплівае ў сваім артыкуле з аднаго з іх, Андрэя Роса Соркіна, які працуе на канале CNBC, што выказаўся фактычна ад імя ўрада ЗША. З чаго б тады такое атаясамліванне з урадам і расчараванне ў тым, што нельга неадкладна злавіць Сноўдэна?

Аўтар прыводзіць таксама два выпадкі, калі падобнага роду супрацоўнікі вядучых СМІ Амерыкі прапаноўвалі арыштаваць незалежнага журналіста, які спрыяў Сноўдэну ў раскрыцці ўтоенай ад амерыканскага народа інфармацыі або выказвалі пункт гледжання, што гэта крымінальнае злачынства. І дзівіцца — калі адзін журналіст прапаноўвае арыштаваць іншага журналіста.

Большасць каментатараў падзяляе пазіцыю аўтара артыкула. Як адзначае адзін з іх: «Сродкі масавай інфармацыі не кантралююцца дзяржавай. Яны кантралююцца карпарацыямі... якія кіруюць дзяржавай». Іншы кпіць з сітуацыі, адзначаючы: «Мець маштабны апарат урада па шпіянажы за грамадзянамі цалкам законна. А вось распавесці грамадзянам, што мы знаходзімся пад маштабным сачэннем урада з'яўляецца здрадай і крымінальным злачынствам». Яшчэ адзін з каментатараў лічыць, што: «Насамрэч тое, што мы маем, горш, чым сродкі масавай інфармацыі, што кантралююцца дзяржавай». Другі піша ў адказ: «Цалкам згодзен, таму што яны ўводзяць людзей у зман, прымушаючы лічыць, што яны з'яўляюцца незалежнымі». На думку яшчэ аднаго каментатара: «Галоўныя навінавыя СМІ могуць быць БОЛЬШ карумпаванымі, чым любыя іншыя карумпаваныя арганізацыі ва ўсім нашым грамадстве». Іншы лічыць: «Я прыйшоў да высновы, што большасць сродкаў масавай інфармацыі знаходзіцца пад кантролем дзяржавы — паглядзіце, як амаль усеагульная ўвага ў СМІ надаецца палітыкам і людзям, якія настойваюць на арышце Сноўдэна і асуджэнні яго за шпіянаж, у той час як большасць людзей на вуліцы, здаецца, рады таму, што Сноўдэн прыцягнуў нашу ўвагу да PRISM. Зрэшты, я лічу, што сродкі масавай інфармацыі так або інакш знаходзяцца пад кантролем нешматлікай эліты працяглы час...».

Яшчэ адзін каментатар звярнуў увагу на другі бок праблемы: «Я думаю, што сутнасць у тым, што ўрад ЗША выкарыстоўвае тайныя суды для таго, каб узаконіць набыццё і захоўванне вялікай колькасці назіранняў за грамадзянамі. Сноўдэн парушыў закон, таму што гэта быў адзіны рэальны спосаб, каб выкрыць гэтае каварнае парушэнне нашых грамадзянскіх свабод і гарантаваць, што гэтая інфармацыя непасрэдна стане вядомай амерыканскаму народу. Парушэнне ім закона з'яўляецца пабочнай гісторыяй. Амерыканскі ўрад траціць так шмат энергіі, каб злавіць яго, дык як наконт таго, каб выдаткаваць гэтую энергію на тое, каб на справе зрабіць сваю палітыку больш празрыстай?».

З улікам гэтага прэтэнзіі ЗША да Беларусі аб тым, што ў нас празмерна шмат СМІ з'яўляюцца дзяржаўнымі, выглядаюць бессэнсоўна. Форма ўласнасці не важная, па-сапраўднаму важнае імкненне аб'ектыўна асвятляць тое, што адбываецца. І вось якраз з гэтым карпаратыўная прыналежнасць вядучых СМІ ў ЗША згуляе дрэнны жарт. Зрошчванне найбуйнейшых карпарацый ЗША з дзяржаўным апаратам дазваляе ім пад маскай аб'ектыўнасці і незалежнасці не толькі падаваць той пункт гледжання, што выгадны перш за ўсё ім, але і, прыкрываючыся дзяржаўнымі інтарэсамі, фактычна маніпуляваць дзяржаўным апаратам. Калі амерыканскім нафтавым карпарацыям трэба захапіць іракскія радовішчы нафты, пачынаецца кампанія праз падкантрольныя СМІ аб наяўнасці зброі масавага паражэння ў Іраку. А тое, што ў выніку ўварвання амерыканская армія забіла дзясяткі тысяч невінаватых грамадзян Ірака, а амерыканская дзяржава нарабіла даўгоў на 2 трыльёны долараў, ім не цікава. Іх прыбыткі атрыманы.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ФІЛЬМ АБ НОВАЙ ЭКАЛАГІЧНАЙ ПАГРОЗЕ

Навучальны фільм «Увага! Сумнік!» стаў даступны для прагляду ў інтэрнэце. Ён прысвечаны новай пагрозе для прыроды Беларусі — імкліваму распаўсюджванню сумніка канадскага.

Па ступені небяспекі для навакольнага асяроддзя і дабрабыту чалавека гэты чужародны від знаходзіцца ў адным шэрагу з баршчэўнікам Сасноўскага і каларадскім жуком. Фільм аб сумніку падрыхтаваны па ініцыятыве Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі ў рамках выканання праекта Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду «Біяразнастайнасць». Паглядзець яго можна, у прыватнасці, на сайце Мінпрыроды.

Па словах начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Наталлі Мінчанка, барацьба з інвазіўнымі відамі жывёл і раслін — адна з асноўных задач па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі нашай краіны ў экалагічнай сферы. Бо замежны захопнік ужо сёння наносіць вялікія страты не толькі прыродзе Беларусі, але і лясной і сельскай гаспадарцы. Зараз гэты працэс яшчэ можна ўзяць пад кантроль, лічыць Наталля Мінчанка. На яе думку, калі мы не здолеем спыніць распаўсюджванне агрэсіўнай канадскай расліны, то ўжо праз некалькі гадоў гэта запатрабуе ад нас велізарных намаганняў і сродкаў.

Леанід ТУГАРЫН.

П'ЯНЫ МІНЧАНІН З БАЛКОНА ЗАСТРЭЛІЎ СУСЕДА ПА ПАД'ЕЗДЗЕ

Упраўленне Следчага камітэта Беларусі па горадзе Мінску завяло крымінальную справу па факце забойства, учыненага пры абцяжарвальных абставінах. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю Следчага камітэта Беларусі.

Высветлена, што жыхар Мінска 1961 года нараджэння, знаходзячыся на балконе сваёй кватэры, стрэліў з гладкаствольнай стрэльбы ў суседа па пад'ездзе 1980 года нараджэння, які знаходзіўся на вуліцы. Ад атрыманых пашкоджанняў апошні памёр на месцы.

«Праведзенымі першапачатковымі следчымі дзеяннямі высветлена, што падазраваны знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Матывы ўчынення злачынства высвятляюцца», — распавялі ў СК. Падчас агляду месца здарэння былі выяўлены і канфіскаваны прадметы, якія мелі даказальнае значэнне па справе, у тым ліку прылада ўчынення злачынства. «Стральба» затрымалі супрацоўнікі атрада міліцыі асаблівага прызначэння ГУУС Мінгарвыканкама.

Следчыя працягваюць працу, накіраваную на высвятленне ўсіх акалічнасцяў здарэння.

Кар. БЕЛТА.

ЖЫХАР МАГІЛЁВА ВЫКРАЎ ЧАТЫРЫ МАШЫНЫ ЗА АДНУ НОЧ

На чатырох чужых аўтамабілях за адну ноч паспеў пакатацца 30-гадовы магіляўчанін, раней судзімы за крадзеж і рабаванне. Пра гэта паведамілі БЕЛТА ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама.

Пасля распіцця спіртнога разам са сваяком маладога мужчыну пацягнула на подзвігі, і ён адправіўся на начную прагулку. Праходзячы па вуліцы Індустрыяльнай, ён заўважыў аўтамабіль «ВАЗ-2107», адчыніў яго, завёў і паехаў катацца, а потым вырашыў спаліць машыну, знішчыўшы такім чынам доказы злачынства. Прыбыўшыя на выклік супрацоўнікі МНС выявілі згарэлы аўтамабіль на вуліцы Сялянскай абласнога цэнтра.

Тым часам азартны аўтааматар пайшоў гуляць далей і зноў нагледзеў сабе «ВАЗ-2107». На гэтым аўтамабілі, пратараніўшы металічную агароджу, яздок урэзаўся ў пяціпавярховы дом на вуліцы Урыцкага. Пабітую машыну ён кінуў і пайшоў шукаць новыя прыгоды. Гэтым разам аблюбаваў «ВАЗ-2106», які стаяў у дварах дома па вуліцы Народнага апалчэння. Але не паспеў ён выехаць на процілеглы бок дарогі, як заклінавала руль. Жадаючы завяршыць цыкл няўдалых паездак, ён паспрабаваў шчасця яшчэ на адной машыне «Жыгулі», але толькі крануўшыся, урэзаўся ў суседні аўтамабіль.

Раніцай уладальнікі ўсіх сагнаных машын звярнуліся ў міліцыю. Па адбітках пальцаў рук, пакінутых у машынах, выйсці на след зламысніка было не цяжка. Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў яго затрымалі супрацоўнікі крымінальнага вышуку. Мужчына растлумачыў, што ў некаторых машын спрацоўвалі ахоўныя сігналізацыі, аднак даведацца, што адбываецца, ніхто з уладальнікаў не выйшаў.

ГОМЕЛЬСКІ СПАРТСМЕН ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ЗБІВАННІ ВАСЬМЯРЫХ

23-гадовы гамяльчанін — кандыдат у майстры спорту па боксе, які прафесійна займаецца рукапашным боем, — падазраецца ў збіванні васьмярых мінакоў. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Інцыдэнт адбыўся 30 чэрвеня ў Навабеліцкім раёне Гомеля. Больш як тыдзень доўжыліся праверачныя мерапрыемствы па гэтым факце хуліганства, якія завяршыліся завядзеннем крымінальнай справы. Паводле інфармацыі прэс-службы, увечары згаданага дня ў міліцыю паступіла паведамленне пра бойку каля крамы «Тапаз» абласнога цэнтра. Відавочцы распавялі, што п'яны малады чалавек нанёс удары сустрэчным людзям. Якіх-небудзь канфліктных падстаў для гэтага не было. У выніку ён прычыніў цялесныя пашкоджанні васьмярым гамяльчанам, у тым ліку тром жанчынам, адной з якіх зламаў рабро.

СЛУЖБОВЫЯ АЎТО — НЕ ПРЫВАТНЫЯ

Супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці выявілі парушэнні патрабаванняў заканадаўства пры выкарыстанні службовага аўтатранспарту.

— Вынікі маніторынгу сведчаць пра тое, што асобныя кіраўнікі арганізацый не забяспечваюць выкананне патрабаванняў заканадаўства ў частцы абавязковай праверкі спідометраў службовых аўтамабіляў і захавання міжправерачнага інтэрвалу, — паведамілі ў кантрольным ведамстве. — Напрыклад, у час правядзення ў маі-чэрвені праверак некаторых дзяржаўных органаў Чашніцкага раёна выяўлены парушэнні. Высветлена, што пры вызначаным для спідометраў адпаведным інтэрвале — 24 месяцы — паверка спідометраў пяці службовых аўтамабіляў не праводзілася з моманту пачатку іх эксплуатацыі. А ездзіць на іх пачалі ў 2002, 2003, 2004, 2007, 2009 гадах. Зараз разглядаецца пытанне аб прыцягненні вінаватых асоб да адміністрацыйнай адказнасці. У камітэце нагадалі, што ў адпаведнасці з заканадаўствам за выкарыстанне няспраўных сродкаў вымярэнняў, як і сродкаў вымярэнняў, якія не прайшлі ва ўстаноўленым парадку паверку, прадугледжана накладанне штрафу: ад 1 да 3 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НЕ ТАМ «СЛЯСАРЫЎ»

Слесар завода падазраецца ў крадзяжах з шафак сваіх калег. Раней гэты затрыманы грамадзянін ужо прыцягваўся да адказнасці за аналагічныя злачынствы. Толькі тады ён працаваў на іншым прадпрыемстве і «спецыялізаваўся» на мабільных тэлефонах.

Вярнуўшыся з месцаў пазбаўлення волі, мужчына ўладкаваўся працаваць слесарам. І ўжо літаральна праз тыдзень вырашыў выкарыстаць «адпрацаваную» раней схему.

— У разгар працоўнага дня слесар імкнуўся непрыкметна патрапіць у гардэроб, дзе захоўваліся асабістыя рэчы калег. Пераканаўшыся, што «лішніх вачэй» няма, ён адціскаў край металічнай шафкі і прасоўваў унутр руку, шукаў кашалёк, з якога потым забіраў грошы, — падзяліліся падрабязнасцямі ў Партызанскім РУУС г.Мінска. — Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку затрымалі слесара, калі ён знаходзіўся ў камандзіроўцы. Там, акрамя сваіх службовых абавязкаў, ён паспеў здзейсніць некалькі аналагічных крадзяжоў. Агульная сума шкоды склала больш за 6 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Welcome to Беларусь

З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА ІМІДЖ КРАІНЫ?

Каб любіць Беларусь нашу мілую, я ўпэўнены, неабавязкова бываць у розных краях. А каб па-новаму паглядзець на сябе, на нашу культуру і на прадукцыю нашых вытворцаў, на стаўленне да нас з боку іншых, дастаткова наведаць месцы, дзе часта бываюць турысты. Замежны турыст, магчыма, і не надта дакладны індыкатар нашага побыту і культуры, але ўбачаная чужымі вачыма наша рэчаіснасць дае падставу і для гонару, і для роздуму.

Нясвіж — адна з культурных сталіц краіны — ніколі не скардзіўся на недахоп увагі айчынных і замежных гасцей. Гарадок дагледжаны, зайздросная прыгажосці замак, касцёл і цэрквы, азёры і паркі, мноства гістарычных помнікаў — гэта вабіць. Апошнім часам заварушыўся нарэшце гасцінічны бізнес — у горадзе падрастае паверхамі гасцініца, істотна пабольшала прыватных пансіянатаў-сядзіб для гасцей. Найбольшы наплыў турыстаў — з пятніцы да нядзелі. На аўтастаянцы непадалёк ад славутага замка па нумарах аўто вывучаем геаграфію: Расія, Польшча, Літва, Украіна, Германія... Хто дасведчаны ў мовах, пачуе і італьянскую, англійскую, румынскую ды яшчэ шмат іншых. Прыемна, што нас наведвае так багата гасцей. Калі едуць — значыць, ёсць дзеля чаго, але паназіраць за турыстамі ў іх вольны ад экскурсій час таксама цікава, асабліва калі прыгледзецца, што яны вязуць з Беларусі «на памяць».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«ЗАЙЗДРОСЦІМ ЯКАСЦІ ВАШЫХ ТАВАРАЎ...»

Найпрасцей вызначыць турыста ў гастраноме: свае, дзякуй Богу, па столькі не купляюць. Маладая пара са Смаленска, якая наведвае Нясвіж на сваім аўто, відавочна, вялікія аматары нашых мясных далікатэсаў:

— Калі мы першы раз прывезлі з Беларусі і пачаставалі сяброў беларускімі каўбасамі, адразу атрымалі заказ другім разам прывезці і ім. Цана, зразумела, вельмі даступная, але галоўнае — якасць прадуктаў. Вось паглядзіце, сёння мы купілі 10 кілаграмаў сыравэнджанай каўбасы, 4 кілаграмы сыру, 30 бляшанак тушонкі з ялавічыны і свініны, 10 пачак сметанковага масла... Вось яшчэ скрыначка ёгуртаў... Усё гэта можна доўга захоўваць, таму так багата «затаварваемся» для сябе і бацькоў. Зайздросцім якасці вашых тавараў, іх прыгожай упакоўцы. Ведаем мы беларускія магазіны і ў нас у Смаленску: ёсць прадуктовы, абутковы, бялізнавы.

Дзве масквічкі, якія наведалі мясцовую прывакзальную краму, напакавалі паўнюткі вазок цукеркамі і шампунямі.

— Такія цукеркі ў нас прадаваліся вельмі даўно, а ў вас яны захавалі натуральны смак шакаладу. І сам шакалад добры — і гомельскі, і мінскі... Шампуні беларускія таксама якасныя. Мы яшчэ хацелі б набыць нешта льняное — вопратку, сталовыя наборы і пасцельную бялізну.

ВЫСОКІЯ БАРДЗЮРЫ І МАЛЕНЬКІЯ КАВЯРНІ

Кіроўца турыстычнага аўтобуса з Падмаскоў'я пачуваецца ў Нясвіжы як свой:

— Прыкладна з год бываю ў Нясвіжы кожныя два-тры тыдні. Бываем таксама ў Віцебску, Мінску, Дудутках, у Мірскім замку. Прыгожыя дарогі, кіроўцы на трасе ветлівыя. Адзінае, што часам раздражняе — маленькія прыдарожныя кавярні і невялікі асартымент страў у іх. Я вязу чалавек 30-40, так што часам на кароткі «перакус» выпадае каля гадзіны. А тут, у Нясвіжы, на вуліцах вельмі многа «спячых паліцэйскіх», але гэта не крытычна, бо многа пешаходаў і веласіпедыстаў. І яшчэ як кіроўца, адзначу надта высокія бардзюрныя камяні ў беларускіх гарадах і тут, у Нясвіжы — гэта нязручна. У вас жа з гор патокі вады не льюцца?

ДЗЕ ДЗЯРЖАЎНЫ ГАНДАЛЬ?

Слухаючы ўражанні турыстаў пра Нясвіж, трэба памятаць і пра тое, што кожны з іх — патрыёт і сваіх мясцін, таму павінен бачыць і ў нас не толькі адно добрае. Як вядома, у чужым воку вялікае бачым, якім бы малым яно не было. Хаця крытычных заўваг ад тых, хто гасцюе ў нас, дабіцца няпроста. Вось тры кабеты, назваліся ленінградкамі:

— Не, крытычна пра Беларусь мы ніколі нічога не скажам. Як жанчын нас яшчэ цікавяць вашы беларускія тканіны льняныя, бялізна. Шкада, што на вашых рынках амаль не прадаюць, а толькі імпартнае ўсё. Нам крыху смешна, што ў сувенірных крамах многа расійскіх матрошак і таннай замежнай біжутэрыі. Матрошак мы і дома купім, ды і гэтай біжутэрыяй у нас таксама ўсё завалена... Вось і ў Нясвіжы мы абышлі некалькі крам, набралі многа чаго, але ручной работы кераміку, вышыванкі, карункі, саломку толькі вось тут набылі, у народных майстрых... І вельмі нам было прыемна ўбачыць, што на Беларусі ў вас усё ў зеляніне, усе палі апрацаваная. Такія помнікі дагледжаныя, нават у райцэнтры мы бачылі, што на брацкай магіле гарыць Вечны агонь.

Наконт матрошак у дзяржаўных крамах — слушна. І насамрэч, смешнавата — няўжо бракуе беларускіх сувеніраў? Прадаюць матрошак, вядома, і прыватнікі. Але, акрамя прыватнікаў, ні каля Нясвіжскага, ні каля Мірскага замка не відаць дзяржаўнага гандлю — цікавяцца ж госці льняными тканінамі і вырабамі з іх, кандытарскімі вырабамі. Упэўнены, што бралі б госці і згушчонку, і якасныя алкагольныя напоі — «Белавежскую», славутыя нашы бальзамы. Але нейкі, відаць, існуе стэрэатып, што каля месцаў, дзе бывае багата замежных турыстаў, абавязкова прадаюцца толькі сувенірныя вырабы і работы майстроў народнай творчасці. А можа, час і «афіцыйнаму гандлю» зрабіць крокі насустрач турысту?

МЫ АДРОЗНІВАЕМСЯ

Успомнілася, як аднойчы перад Вялікаднем пабываў на нясвіжскіх могілках разам з госцем з Краснадарскага краю, які прыехаў у Беларусь упершыню. Рухаемся па сцяжынцы, чытаем прозвішчы і эпітафіі: Зяньковіч, Гінзбург, Шыманскі, Гетнер, нешта па-польску, зноў па-нашаму, зноў лацінкай. Я тлумачу, што ў нас хаваюць на адных могілках усіх. Госць спыняецца і кажа:

— Могілкі ў вас не па нацыянальным прынцыпе, гэта правільна... Не ведаў, што вы так ад многіх адрозніваецеся...

...Вось і думаецца, як і з чаго складаецца імідж краіны. Аказваецца, і з наяўнасці менавіта беларускіх сувеніраў і тавараў пры нашых гістарычных і культурных аб'ектах, з якасці нашых каўбас і са стану могілак, з вышыні бардзюраў на вуліцах і якасці саміх вуліц... І гэта не вялікая палітыка, якую вядуць тыя, каму гэта належыць і ў каго гэта атрымліваецца. Вось тут, у Нясвіжы і Міры, ды і ў іншых падобных мясцінах, у кожнай краме ад райцэнтра да сталіцы і на кожнай вуліцы мы павінны ведаць, што на нас глядзяць людзі з усяго свету. Дык давайма будзем адпавядаць таму, што мы, беларусы, маем так багата адметнага і свайго ўласнага. І давайце вучыцца годна яго паказваць.

Пятро РАМАНЧУК

Урачыстая працэсія з копіяй цудатворнага абраза Маці Божай Будслаўскай і рэліквіяй святой Тэрэзы.

400 гадоў пад аховай Божай Маці

БОЛЬШ за 40 тыс. католікаў і прадстаўнікоў іншых канфесій прынялі ўдзел ва ўрачыстасці з нагоды 400-годдзя знаходжання цудатворнай іконы Божай Маці ў Будславе. Святары і вернікі з Беларусі, Італіі, Украіны, Польшчы, Расіі змаглі прысутнічаць на ўрачыстай працэсіі. Таксама ў гонар свята адбылося гашэнне паштовай маркі, выпушчанай з нагоды будслаўскага юбілею Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі. Да месца ўрачыстасцяў паломнікі дабіраліся па-рознаму. Так, напрыклад, пешшу прыйшлі каля 4 тыс. вернікаў. Таксама былі веласіпедныя і спецыяльна арганізаваныя аўтобусныя пілігрымкі. Варта адзначыць, што сёлета з пастарскім словам да вернікаў звярнуўся і папскі легат кардынал Жан-Луі Таран, які перадаў бласлаўленне беларусам ад Папы Рымскага Францішка.

Надзея БУЖАН, фота аўтара. *Будслаў*

Гашэнне паштовай маркі, выпушчанай спецыяльна да свята.

Каля 40 тыс. католікаў прыехалі сёлета ў Будслаў.

РЭНТАБЕЛЬНАСЦЬ — 70 ПРАЦЭНТАЎ

1 ліпеня адбылося афіцыйнае адкрыццё абноўленай Рэспубліканскай дошкі гонару. Цяпер на ёй аказаліся пераможцы спаборніцтва 2012 года. Ужо трэці раз на дошку трапіў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Астрамечава» Брэсцкага раёна. Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў са старшынёй паспяховага СВК Аляксеем СКАКУНОМ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Вам у пэўны час давялося выбіраць паміж кар'ерай чыноўніка і складанай працай на пасадзе старшыні калгаса. І вы выбралі апошняе. Чаму?

— Я не любіў гэтай каманды вышэйшых арганізацый. Спачатку працаваў у добрай, моцнай гаспадарцы. А потым мяне паслалі ў самую слабенькую гаспадарку Іванаўскага раёна старшынёй калгаса. Папрацаваў старшынёй, падняў гаспадарку — мяне прызначаюць начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі. І нада мною было тады два вялікія кіраўнікі — першы сакратар і старшыня райвыканкама. І ўсе камандавалі: давай тое, давай гэтае. А я адказваў за ўсю сельскую гаспадарку. Два з паловай гады прапрацаваў начальнікам і напісаў заяву: «Прашу адправіць у гаспадарку, якая адстае». Аб'ядналі дзве гаспадаркі Брэсцкага раёна, дзве Камянецкага — і я пайшоў туды старшынёй. І не шкадую.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Вынікі спаборніцтваў па дасягненні найлепшых паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця ў Беларусі падводзяць з 1999 года, афіцыйнае адкрыццё Рэспубліканскай дошкі гонару адбылося ў 2000 годзе.

Ведаеце, зараз успомніў, як некалі сядзеў дома разам з пісьменнікам Уладзімірам Сітухам. І ён усё «галоўнейшы араты» ды «галоўнешы араты». А маці мая слухала-слухала, пасля вымавіла: «Нас у сям'і было васьмёра. Вас у нас чацвёра. У цябе з Валюшай двое. У дзяцей тваіх — па адным. Калі далей так пойдзе, каму тады зямлю араць?»

— Вы ўзначальваеце Беларускі аграпрамысловы саюз. У межах Мытнага саюза ваша арганізацыя падтрымлівае сувязь з калегамі з Расіі і Казахстана?

— Безумоўна. Я вам скажу, што нам зараз усе зайздросцяць. Бо многія пайшлі па шляху фермерства. Да нас цяпер ездзяць, каб павучыцца. Калі я прыйшоў у гаспадарку, удой быў 2000 літраў на карову. А зараз — 8200. Гэта вельмі выдатны вынік.

— Значыць, вы лічыце буйныя гаспадаркі больш эфектыўнымі?

— Так, сапраўды. І думаю, што гаспадаркі павінны быць грамадскай формы ўласнасці. Гэта, вядома, асабіста маё меркаванне. Але зараз кажуць — фермер зрабіў тое, зрабіў сёе. Аднак шмат фермер не зробіць. Паглядзіце, якая магутная сучасная тэхніка: раней у гаспадарцы было 50 камбайнаў, а цяпер працуе і збірае ў два разы болей усяго толькі 19. Гэта і машыны «Гомсельмаша», і John Deere. Але сёння і палі іншыя, бо раней і ў нас былі палі, дзе ляжаў камень на камені. Камбайн ішоў і вельмі часта ламаўся. Раней казалі: «Камні растуць на палях». Сёння ў нас палі чысценькія. Раней камні ніхто не збіраў, а мы сабралі. Мы шмат таксама зрабілі па зносе хутароў. Прычым не прымусова. Пенсіянеры самі жадалі перайсці ў вёску, бо на хутары ні пазваніць нельга, ні «хуткую дапамогу» выклікаць. Папераносілі іх дамкі ў вёску — жывіце, калі ласка. І людзям у вёсцы лепей, і нам лепей, каб людзі былі ў вёсцы, бо гэтыя хутары не даюць магчымасці нармальна працаваць нашым камбайнам — іх аб'ехаць складаней, чым перарабіць. І маем цяпер рэнтабельнасць — 70 працэнтаў. Вось трэці раз ўжо на дошцы гонару (раней па выніках 2001 і 2009 гадоў. — **Аўт.**). Нашай працай быў здзіўлены і Пётр Клімук. Яго ўразілі сучасныя даільныя залы, дзе камп'ютары за ўсім сочаць. Ён казаў пасля, што ўпершыню бачыў, каб каровы ішлі на дойку шэрагамі і пад музыку.

— Ці правільна я зразумеў, што ўзбуйненне рынку з дапамогай Мытнага саюза будзе толькі на баку нашых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі?

— Так, натуральна. Нашы буйныя гаспадаркі больш канкурэнтаздольныя. Канцэнтрацыя працоўных рэсурсаў выклікае больш значную аддачу. Фермер жа не можа дазволіць сабе добрую тэхніку, аб'ёмы ў яго меншыя.

— У сваёй кнізе «Адзінае выйсце» вы пішаце пра своеасаблівыя «НЭПы Астрамечава». У чым іх сутнасць?

— Першы НЭП — гэта навядзенне элементарнага парадку: на дварэ, на полі — паўсюль. Другі — новая эканамічная палітыка: рабіць так, каб былі найменшыя выдаткі і найбольшы прыбытак. Трэці — навукова-эканамічны прагрэс. І зараз ёсць яшчэ два НЭПы. Я пра іх яшчэ не пісаў. Чацвёрты — новая экалагічная прадукцыя: мы самі перапрацоўваем свае малако. У Брэсце па яго стаяць чэргі. У нас яно захоўваецца ўсяго трое сутак, а значыць — сапраўднае. Робім таксама і марожанае, і сыркі, і сыры. У нас вельмі вялікія сады, таму яшчэ адна наша прадукцыя — яблычныя чыпсы. А пяты НЭП — навука, эканоміка, вытворчасць: нам патрэбны людзі, звязаныя з навукай, бо зараз «на дурня» нічога не атрымаецца. Мой дзед некалі мяне вучыў араць, сеяць і казаў: «Хочаш добра жыць на гаспадарцы? Тады бяры на лапату паболей, а кідай падалей». А сёння гэты прынцып не дзейнічае. Цяпер патрэбна навука, трэба не лапатамі, а мазгамі варушыць. З 850 чалавек у нашай гаспадарцы 100 з вышэйшай адукацыяй. Ёсць кандыдаты навук. Займаюцца вопытамі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ЭПІЗОДЫ БАЁЎ ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ ЎЗНАВІЛІ НА «ЛІНІІ СТАЛІНА»

На тэрыторыі гісторыка-культурнага комплексу «Лінія Сталіна» 7 ліпеня прайшоў VI Міжнародны ваенна-гістарычны фестываль «Лета 44-га. Аперацыя «Баграціён». Фестываль прысвечаны баям па вызваленні тэрыторыі Беларусі.

Фота БЕЛТА.

ПУСТУЮЧЫЯ БУДЫНКІ: «ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ»

■ Тэма дня

Ва ўсіх рэгіёнах краіны створаны і ўжо распачалі працу рабочыя групы з мэтай дадатковага абследавання аб'ектаў нерухомасці і вызначэння варыянтаў іх эфектыўнага выкарыстання. Шмат аб'ектаў знайшлі новых уладальнікаў пасля продажу на аўкцыёнах, ёсць і ў каго павучыцца гаспадарскаму падыходу да такіх будынкаў. Але ёсць і пралікі. Сваімі думкамі на гэты конт падзяліўся дырэктар фонду «Гроднааблмаёмасць» Аляксандр ВІСКУБ.

ДЛЯ КОЖНАГА АБ'ЕКТА — СВОЙ ВАРЫЯНТ

З ім мы гутарылі пасля пасяджэння Іўеўскага райвыканкама, дзе разглядаліся пытанні задзейнічання ў гаспадарчы абарот аб'ектаў раённай камунальнай уласнасці. Здавалася б, паказчыкі ў гэтай сферы някепскія: за апошнія пяць гадоў у невялікім і, мусіць, не самым прывабным для бізнесу раёне, на аўкцыёнах прадалі 14 аб'ектаў. І тым не менш, увагу на пасяджэнні засяродзілі не на гэтым, а на слабых месцах, дзе трэба больш аператыўна дзейнічаць. Ішла дэтальная размова наконт перспектыў літаральна кожнага пустуючага аб'екта.

— У Іўеўскім раёне практычна па кожным аб'екце вызначыліся, якім спосабам ён будзе ўводзіцца ў гаспадарчы абарот. Для гэтага карыстаюцца ўсімі механізмамі, якія сёння дазволены заканадаўствам, — зазначае Аляксандр Віскуб.

Пры гэтым адпаведная нарматыўна-прававая база ў краіне, на яго думку, належным чынам удасканалена і практычна няма нічога, што магло б стрымліваць работу па наданні «другога жыцця» пакуль непатрэбным будынкам. Адсюль і станоўчая тэндэнцыя: за апошнія пяць гадоў удзельная доля плошчаў, што не выкарыстоўваюцца па камунальнай маёмасці, на Гродзеншчыне скарацілася з 7,5 да 1,5%.

НЕ ЎСІМ ШАНЦУЕ...

Разам з тым, існуючыя рэаліі не заўсёды спрыяюць пошуку новых гаспадароў для пустуючых аб'ектаў нават на ўмовах значнага зніжэння пачатковай цаны — на 20, 50, 80%. Найбольш праблематычна прадаць будынкі, размешчаныя ў глыбінцы. Нягледзячы на шырокую рэкламную кампанію, далёка не заўсёды ўдаецца зацікавіць патэнцыяльных пакупнікоў. Здавалася б, навошта пуставаць будынкам былых сельскіх школ, многія з якіх знаходзяцца ў нармальным стане і не патрабуюць капітальнага рамонту? Ды і каштуюць нядорага, магчымы нават варыянт продажу з пачатковай цаной ад адной базавай велічыні. Аднак такія спецыфічныя будынкі праблематычна прыстасаваць пад вытворчасць, ды і пад аграэкатурызм складана — надта вялікія плошчы.

Ёсць падобныя «балявыя кропкі» і ў Іўеўскім раёне. Напрыклад, праведзены шэраг аўкцыёнаў па комплексе будынкаў былой Старчаніцкай базавай агульнаадукацыйнай школы, па будынку былога Суражскага сельскага клуба. Прычым у абодвух выпадках пачатковая цана на таргах тройчы паніжалася на 80%. Аднак безвынікова. І вось — чарговы крок: рыхтуецца пакет дакументаў для продажу гэтых аб'ектаў на аўкцыёне з пачатковай цаной, роўнай адной базавай велічыні.

Можа, цяпер ім пашанцуе на клапатлівага гаспадара? Як, напрыклад, будынку ў райцэнтры, дзе пасля рамонту адчынены гандлёвы дом «Электронік» па продажы бытавой тэхнікі *(на здымку)*. Альбо будынку былога клуба-бібліятэкі ў вёсцы Ляпешкі, дзе цяпер прадуктовая крама «Гасцінец».

Усміхнулася ўдача і аб'ектам былога кансервавага завода, прададзеным на аўкцыёне (пры пачатковай цане, роўнай адной базавай велічыні) лідскаму таварыству з абмежаванай адказнасцю «Тэхмаш» для вытворчасці сельскагаспадарчай тэхнікі. Тое, што было ў перыяд ліквідацыі завода, і што цяпер — гэта, як той казаў, зямля і неба. Новы ўласнік цалкам адрамантаваў будынак былога кансервавага цэха і часткова — пад'язную дарогу, увёў у работу падстанцыю, кацельню, каналізацыйную і вадаправодную сеткі... І што найбольш важна для раёна, які не з'яўляецца прамысловым, — створана 70 рабочых месцаў.

НА «ЎСЯКІ ВЫПАДАК» НЕ АТРЫМАЕЦЦА

Нядаўна Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці правёў маніторынг далейшага лёсу аб'ектаў, прададзеных новым уласнікам на ўмовах ад адной базавай велічыні. Як правіла, гэтыя аб'екты (каля 90%) уключаюцца ў гаспадарчы абарот і працуюць. Аднак ёсць і факты, калі дагаворы куплі-продажу не выконваюцца.

Аб'екты дзяржавай не проста так раздаюцца, а на пэўных умовах, гаворыць Аляксандр Віскуб. Прычым у кожным канкрэтным выпадку падыход да ўмоў продажу індывідуальны — у залежнасці ад спецыфікі аб'ектаў. І калі дагаворы не выконваюцца, то маёмасць, якая была прададзена за базавую велічыню, вяртаецца ў дзяржаўную ўласнасць. Пры гэтым затраты на аднаўленне, рамонт гэтага аб'екта

пакупніку не кампенсуюцца.

Гэтыя затраты, дарэчы, могуць у дзясяткі, а то і ў сотні разоў перавышаць адну базавую велічыню. На Гродзеншчыне ўжо здаралася, калі пачатковая цана продажу аб'екта ў памеры адной базавай велічыні на аўкцыённых таргах павялічвалася да дваццаці і нават сарака мільёнаў рублёў.

— Таму, набываючы аб'ект нават на «казырных» умовах адной базавай велічыні, трэба мець дакладны інвестыцыйны праект і магчымасці для яго рэалізацыі. Купіць аб'ект «на ўсякі выпадак» не атрымаецца — ён павінен працаваць, быць карысным і для яго гаспадара, і для эканомікі рэгіёна, — зазначае Аляксандр Віскуб.

Барыс ПРАКОПЧЫК

ПЕРШАЯ СУСВЕТНАЯ ВАЙНА: ПАМЯЦЬ ПАВІННА ЖЫЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

АКТУАЛЬНАСЦЬ

Уладзімір МАТУСЕВІЧ, намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь:

— Першая сусветная вайна — падзея, якая фактычна стала пачаткам найгоршага часу, яна змяніла вельмі многія ўяўленні пра нашу цывілізацыю: пра месца чалавека ў грамадстве, пра месца многіх тэхнагенных і іншых рэчаў, палітычныя і эканамічныя аспекты. Невыпадкова вывучэнне вопыту Першай сусветнай вайны патрабуе комплекснасці і ўдумлівага падыходу. Мы павінны асэнсаваць тыя падзеі не толькі з пункту гледжання нашай гісторыі, а і з пазіцыі фарміравання гістарычнай памяці, уяўленняў пра тыя глыбінныя крыніцы і нават магістральныя тэндэнцыі сённяшняга геапалітычнага развіцця.

Гэтая тэма мае вельмі вялікія рэзервы і пласт для вывучэння яе гісторыкамі і для глыбокага грамадскага асэнсавання. У поўнай меры гэта тычыцца і Беларусі, таму што шэраг ключавых падзей адбыліся менавіта на беларускай зямлі: буйнейшыя вайсковыя аперацыі, падзеі, якія пасля сталі каталізатарам вялікіх сацыяльна-палітычных рухаў, асабліва ва Усходняй Еўропе. Найперш гэта Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая пасля стала штуршком да беларускай дзяржаўнасці, з'яўленне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Дэталёвае вывучэнне гэтых падзей, напэўна, можа даць многія адказы, дадатковы цікавы вопыт і разуменне наступстваў Вялікай Еўрапейскай вайны. Гэтая тэма плённая для распрацоўкі не толькі гістарычнай і навуковай супольнасцямі, даследчыкамі, а і журналістамі. Мы не павінны пакідаць гэтыя падзеі ў баку ад вывучэння, ад грамадскай увагі. Трэба, каб гэтая тэма загучала: яна мае вялікае значэнне для постсавецкай прасторы, для Беларусі, для агульнаеўрапейскага, агульнасусветнага кантэксту.

ПРАБЛЕМЫ

Вадзім ГІГІН, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка», першы намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў:



— У апошнія гады сітуацыя змянілася: зараз ужо нельга сказаць, як раней, што праблемы Першай сусветнай вайны знаходзяцца на перыферыі айчыннай і расійскай гістарыяграфіі. Усё больш з'яўляецца навуковых прац на гэтую тэму. І мы павінны іх уводзіць і ў наша беларускае кола. Я бачу тут некалькі праблем, якія паўстануць перад намі і якія трэба будзе вырашаць грамадскасці, навукоўцам і журналістам.

Па-першае, як нам ставіцца, які погляд павінен быць, які акцэнт, калі мы разглядаем падзеі Першай сусветнай вайны? Звычайна пытаюцца: якое месца Беларусь займала ў часы гэтай вайны, кім яна была — суб'ектам ці аб'ектам гэтага гістарычнага працэсу? Па-другое, 11 лістапада мы святкуем Дзень прымірэння. Аднак відавочна, што для нас Першая сусветная вайна скончылася крыху раней — у пачатку 1918 года. Зноў-такі геапалітычны кантэкст: што дала Першая сусветная вайна Беларусі? З іншага боку, з'яўляецца ўсё больш прац, якія разглядаюць грамадзянскую вайну і нават савецка-польскую вайну як працяг Першай сусветнай вайны. І сапраўды, разглядаць гэтыя падзеі ў адрыве ад кантэксту Першай сусветнай вайны немагчыма. Для Беларусі ўвогуле была ўнікальная з'ява падчас імперыялістычнай вайны — Брэсцкі мір, які таксама нельга абмінаць. У савецкія часы існаваў адзін погляд на Брэсцкі мір, у міграцыйным друку — іншы. Які зараз мы павінны выпрацаваць? Яшчэ адзін цікавы момант — ваенная справа падчас Першай сусветнай вайны. Зараз у публіцыстыцы ідзе актыўная дыскусія, хто быў больш таленавітым, а хто менш. Гэта тыя ж Нарачанская і Баранавіцкая аперацыі, якія можна па-рознаму трактаваць.

Нарэшце, культурны аспект. Я хачу нагадаць, што і Янка Купала, і Якуб Колас, і іншыя культурныя дзеячы насілі вайсковую форму. Гэта вялікі патэнцыял для развіцця турызму, патрыятычнага выхавання. У нас усё гэта ёсць у тэме Вялікай Айчыннай вайны. Гэта вельмі добра. Аднак нельга толькі на адной падзеі, хоць такой важнай і значнай, выхоўваць наступныя пакаленні ці расказваць свету аб Беларусі. Так, у нас шмат замкаў, але ёсць і вялікая спадчына Першай сусветнай вайны. Яна скончылася, але, як значная падзея гісторыі, яна працягваецца ў нашым жыцці. І вось як асэнсоўваць гэтыя падзеі, ад гэтага будзе залежаць і тое, як Беларусь будуць успрымаць у свеце і якое ўяўленне будзе мець наступнае пакаленне аб гісторыі нашай краіны.

ВАЙСКОВЫ ПОГЛЯД

Віктар ШУМСКІ, начальнік упраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь:

— Памятаеце словы гісторыка Ключэўскага, які казаў: «Гісторыя не настаўніца, а наглядчыца. Яна не вучыць, а карае за нявывучаныя ўрокі»? У 1941 годзе мы якраз і былі пакараны за нявывучаныя ўрокі. Таму сёння вельмі важна пэўным чынам выправіць сітуацыю.

Гэта тычыцца і практычных крокаў, якія ажыццяўляе Міністэрства абароны. Калі мы сустракаліся напярэдадні 90-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны, на той момант у нас на дзяржаўным уліку былі зарэгістраваны 34 воінскія пахаванні Першай сусветнай вайны. Сёння іх 137. На самой справе іх значна больш. Тая колькасць, якая значыцца на месцах пахаванняў, не заўсёды адпавядае дакументальным крыніцам. Тым не менш са 137 воінскіх пахаванняў 23 пахаванні — могілкі замежных ваеннаслужачых, 114 — могілкі суайчыннікаў. Зараз у нарматыўную базу мы ўводзім такое паняцце, як «змешанае пахаванне», чаго раней не было. Праўда, пакуль яны яшчэ не пашпартызаваны. Асноўны масіў такіх пахаванняў знаходзіцца ў заходняй частцы Беларусі, асабліва ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях. У народзе іх і сёння называюць «нямецкімі». Толькі гэта не зусім так. Напрыклад, у адной такой «нямецкай магіле», якую я нядаўна пабачыў, было пахавана 530 рускіх салдат і афіцэраў.

З 1997-га па 1999-ы Міністэрствам абароны двойчы былі праведзены разавыя пошукавыя акцыі, якія не былі абгрунтаваны дакументальна. З 2003 года гэта стала штогадовай традыцыяй: палявыя пошукавыя падраздзяленні кожны год адпрацоўваюць ад 5 да 12 аб'ектаў, звязаных з Першай сусветнай вайной. Што тычыцца рэгіёнаў, то за гэты час у Брэсцкай вобласці мы адпрацавалі 23 аб'екты, у Гродзенскай — 48, у Мінскай — 38, у Магілёўскай — 2.

Сёлета намі была праведзена эксгумацыя астанкаў 5 ваеннаслужачых Рускай імператарскай арміі. Гэта толькі на адным аб'екце. На гэты год запланавана адпрацоўка яшчэ 4 такіх аб'ектаў. Трэба сказаць, што навідавоку будзе мэтазгодная работа ў Расійскім дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве. Таму трэба акцэнтаваць увагу грамадскасці і людзей, што жадаюць займацца гэтай тэмай, менавіта на архіўна-даследчай працы, якая павінна быць сінхранізаванай. Гэта значыць, калі будзе прымацца рашэнне па аднаўленні тых ці іншых воінскіх пахаванняў Першай сусветнай вайны, то гэтыя моманты жыццёва неабходны з пункту гледжання выдаткаў і закончанасці той работы, якая будзе праводзіцца.

Адна з асноўных праблем на фоне вялікага масіву пахаванняў — пошук сродкаў на іх аднаўленне. Невыпадкова ў наступным годзе частка сродкаў ад традыцыйных суботнікаў будзе накіравана на добраўпарадкаванне могілак Першай сусветнай вайны.

ПЕРСПЕКТЫВЫ

Уладзімір ЛІХАДЗЕДАЎ, гісторык, філакартыст, калекцыянер, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне»:

— Беларусь — маладая краіна. Таму як незалежная дзяржава яна не прымала ўдзелу ні ў адной вайне. Мы заўсёды ваявалі ў складзе якой-небудзь краіны: у Першую сусветную вайну — у складзе Расійскай імперыі, у Вялікую Айчынную — у складзе Савецкага Саюза... Таму для нас, для Беларусі, самае галоўнае — увекавечванне памяці ўвогуле ўсіх палеглых у Першай сусветнай вайне, не прымаючы нічый бок.

Я займаюся калекцыянаваннем, вывучэннем старых фотаздымкаў і магу сказаць, што на іх адлюстраваны сотні могілак. Вельмі шмат нямецкіх, аднак дзіўна, што на іх — вялікая колькасць праваслаўных крыжоў. Гэта дае падставу думаць, што нават прадстаўнікі кайзераўскай арміі не баяліся хаваць салдат царскай арміі на сваіх могілках.

Самае галоўнае — па магчымасці аднавіць воінскія пахаванні на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, адкрыць пэўныя, няхай і невялікія, памятныя знакі на месцах баёў і пахаванняў. І яшчэ адна з задач — адкрыццё музея Першай сусветнай вайны, якога няма ў нашай рэспубліцы. Ёсць невялікі музей у Заброддзі, створаны намаганнямі Барыса Цітовіча. Толькі для краіны ў дзяржаўным маштабе павінен існаваць даволі сур'ёзны музей, дзе людзі, асабліва моладзь, магла б даведацца пра Першую сусветную вайну.

У Вілейцы мы сваімі сіламі аднавілі помнік 1812 года і побач плануем зрабіць помнік ахвярам Першай сусветнай вайны. Таксама ў перспектыве — адкрыццё на базе Заброддзя больш сур'ёзнага музея, дзе я прадстаўлю свае арыгінальныя фотаматэрыялы, якіх у мяне больш за 10 тысяч. Па гэтых фотаздымках можна вывучаць усю Першую сусветную вайну. Да 90-годдзя заканчэння вайны я выпусціў вялікі альбом «Беларусь вачыма нямецкага салдата ў час Першай сусветнай вайны». На дзіва, вялікім поспехам ён карыстаўся больш за мяжой, чым у Беларусі. Да 100-годдзя пачатку вайны планую выпусціць вялікі двухтомнік, у якім будзе паказана менавіта Беларусь падчас вайны з двух бакоў — з расійскага і нямецкага: побыт, жыццё ў акопах, баявыя дзеянні, могілкі, Брэст-Літоўскі мір... Усё гэта будзе адлюстравана на фотаздымках — найбольш бесстаронніх сведках.

МУЗЕЕФІКАЦЫЯ

Барыс ЦІТОВІЧ, мастак, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне»:

— Я не гісторык, аднак аказаўся ў гэтай тэме вельмі даўно. І шчыра кажучы, мару, калі ўсё з ёй будзе добра, каб выйсці з яе і заняцца, нарэшце, творчай працай, не выключаючы работу мастака менавіта па гэтай тэме. Пакуль гэтага не ўдаецца.

Я прыхільнік музеефікацыі слядоў Першай сусветнай вайны. З гэтай ідэяй мы носімся вельмі даўно. Я зафіксаваў, што апошняе маё інтэрв'ю аб тым, што рэспубліцы патрэбен новы музей уздоўж лініі фронту, было 23 лютага 2002 года на тэлебачанні. Прайшло 11 гадоў — музея няма. Тым не менш я абсалютна ўпэўнены, што мадэль музея ў Рэспубліцы Беларусь павінна быць вельмі своеасаблівай: менавіта тут лінія фронту была непераадольнай перашкодай для кайзераўскіх і аўстра-венгерскіх войскаў. І навідавоку, што тыя артэфакты, фарсіфікацыйныя збудаванні, пахаванні, акопы, якія захаваліся, патрэбна музеефікаваць, пераўтвараючы ўсё гэта ў мемарыяльны маршрут Першай сусветнай вайны. У нас, куды не ідзеш — трапляеш на сляды вайны 1812 года, Першай сусветнай, Другой сусветнай. Гэта не значыць, што ўсе павінны лазіць па акопах. Аднак не ўлічваць гэты момант, калі ў нас ёсць канкрэтная фактаграфія і бачныя сляды, нельга. Больш за тое, трэба казаць пра ваенны ландшафт, які ў нас захаваўся. Кожная вайна мяняе яго на свой лад. Менавіта Першая сусветная вайна змяніла ландшафт беларускай прыроды настолькі, што ён і да гэтага часу, амаль праз 100 гадоў, захаваў гэты вобраз. Калі мы трактарамі будзем раўняць лясы, могілкі, акопы, то мы і гэта страцім.

Калі казаць пра музеефікацыю пад адкрытым небам, то маглі б быць экспазіцыйныя цэнтры, падобныя да Заброддзя, дзесьці ў краязнаўчых цэнтрах, у школах уздоўж лініі фронту. Такім чынам мы атрымалі б недарагую, але вельмі аб'ёмную мадэль, і мемарыяльны турызм мог бы ў рэспубліцы развівацца. Напрыклад, вілейскія школьнікі вось ужо шосты год з задавальненнем ідуць паходамі ўздоўж лініі фронту. Вывучаюць мясціны, ужо зрабілі некалькі цікавых фільмаў. Можна сказаць, што дзіцячы турыстычны маршрут уздоўж лініі фронту існуе. З дарослымі ўсё складаней.

Што тычыцца Вілейскага раёна, то літаральна на днях уладыка Філарэт блаславіў праект на будаўніцтва капліцы-помніка пры ўваходзе на вілейскія могілкі, дзе знаходзілася 300 магіл воінаў Першай сусветнай вайны, на якіх пасля зверху былі пахаваны савецкія грамадзяне. На сённяшні дзень вядома 250 імёнаў. Яшчэ адзін помнік мы рыхтуем у вёсцы Жарсцвянка, што на пад'ездзе да Вілейкі. Там знаходзілася брацкая магіла, якую знішчыла суцэльная высечка лесу.

ЧЫЯ ВАЙНА?

Валерый СУРАЕЎ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь:

— Як ставіцца Рэспубліцы Беларусь да праблемы Першай сусветнай вайны: гэта наша вайна ці не наша? Усё часцей гучыць гэтае пытанне. Напярэдадні 100-годдзя вайны яно набывае ключавое значэнне. Таму задача людзей, якія настроены канструктыўна і думаюць сапраўды гістарычна, — давесці да ведама не толькі нашых грамадзян, а і замежных, думку пра тое, што гістарычны працэс непарыўны. Першай сусветная вайна — апакаліпсіс сусветнага маштабу. Вынікі гэтай вайны адбіліся і на лёсах беларусаў. Усе карані Другой сусветнай вайны карэняцца там, у самым пачатку стагоддзя. І большая частка нявырашаных прычын Першай сусветнай вайны сталі прычынамі Другой сусветнай. Дык як жа гэта не наша вайна?

Геапалітычныя наступствы сусветнага маштабу Першай сусветнай вайны тычыліся ўсяго свету. І справа не толькі ў тым, што палі 4 вялікія імперыі. Гэта быў перадзел свету! Ёсць яшчэ маральныя аспекты: трэба растлумачыць людзям увесь жах гэтых падзей. У складзе Рускай імператарскай арміі ваявалі сотні тысяч беларусаў. Нашымі суайчыннікамі здзейснена вялікая колькасць подзвігаў, і ёсць шмат прыкладаў ваеннага таленту. Дарэчы, апошні ордэн Святога Георгія II ступені атрымаў ураджэнец Беларусі — генерал Мікалай Юдзеніч. Усяго за Першую сусветную вайну такіх узнагарод было дзве. Гэта наша вайна! Забыць яе — значыць здрадзіць.

РЭТРАСПЕКТЫВА ПАДЗЕЙ

Вячаслаў БАНДАРЭНКА, кіраўнік і вядучы грамадска-палітычнага ток-шоу «Адкрыты фармат» (АНТ), лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне»:

— Гэтую дату, больш за тое, чараду дат, мы абавязаны выкарыстаць у поўнай меры, па ўсіх кірунках. У тым ліку ў ідэалагічным. Нічога дзіўнага няма ў тым, што Беларусь шануе і ганарыцца сваімі героямі, у якой бы вайне яны не загінулі. Мы ж па-ранейшаму саромеемся гэтай вайны, лічым яе ганебнай, бессэнсоўнай, імперыялістычнай, прайгранай. Па-першае, гэта не так. А калі і так, то што з таго? Героі ёсць. Памяць пра іх існуе. Мы гатовы пра гэта казаць усяму свету. Мы абавязаны наша ўспрыманне гэтай Вялікай вайны распаўсюджваць на ўсю Еўропу, разумець яе ў еўрапейскім кантэксце.

Натуральна, што ў сваіх разважаннях аб тым, што нам трэба зрабіць да гэтых дат, мы павінны быць рэалістамі. Мы не можам зараз замахвацца на тое, каб з нуля ў Магілёве на Савецкай плошчы аднавіць увесь комплекс Стаўкі і ўсе дамы зрабіць музеямі. У нас нават наўрад ці атрымаецца стварыць музей Стаўкі ў Баранавічах. Аднак ёсць мерапрыемствы, якія мы цалкам пацягнем. І нават без асаблівых выдаткаў. Ёсць музей Барыса Цітовіча. Згодзен, ён маленькі, да яго трэба дабрацца. Затое гэты музей — святое месца, адкуль выходзіш з прасветленай душой. З цягам часу ён пашырыцца, наша задача — надаць яму статус нацыянальнага.

Існуе такая рэч, як перайменаванне вуліц. Ніхто не патрабуе іх перайменаўваць: гэта каштуе вялікіх грошай. Аднак у рэспубліцы пракладваюцца новыя вуліцы, і іх трэба неяк называць. Напрыклад, вуліца генерала Лячыцкага. Мы збіраем народ, тлумачым, хто такі генерал Лячыцкі, і чаму называем вуліцу ў яго гонар. І яна так будзе называцца многія гады.

Існуюць даты вялікія: пачатак вайны і яе заканчэнне. Існуюць даты малыя, і іх — велізарная колькасць. У 1915 годзе мы адсвяткуем 100-годдзе вызвалення Вілейкі, Смаргоні, 100-годдзе подзвігу Рымы Івановай — адзінай жанчыны, якая пасмяротна была ўзнагароджана ордэнам Святога Георгія IV ступені. Дарэчы, нядаўна пачаліся здымкі сумеснага расійска-беларускага дакументальнага фільма «Святая Рыма».

1916 год: Нарачанская аперацыя, аперацыя пад Баранавічамі — 2 велізарныя бітвы, якія былі ў Беларусі. Мы можам абмеркаваць, як менавіта можна адзначыць 100-годдзе гэтых аперацый: ці гэта будуць маштабныя рэканструкцыі, ці нешта іншае. 1917 год — 100-годдзе аперацыі пад Крэва, адной з самых удалых аперацый рускай арміі: ніколі за часы Першай сусветнай вайны не атрымлівалася, каб за 3 дні падрыхтоўкі былі знішчаны ўсе варожыя ўмацаванні. 20 лістапада 1917 года адбыўся першы бой ужо іншай — грамадзянскай — вайны на нашай зямлі, пад Жлобінам. І 1918 год — Брэсцкі мір, самы апошні бой Першай сусветнай вайны на нашай зямлі, вызваленне станцыі Добруш і заканчэнне вайны.

Я пералічыў элементарныя рэчы, якія ляжаць на паверхні. Гэтая схема ўжо ўхвалена Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам інфармацыі. Каб распрацаваць яе больш глыбока, падумаць як яе можна ажыццявіць, нам трэба думаць разам.

ПРЫМІРЭННЕ

Аляксандр БАЗАРНАЎ, эксперт па ваеннай гісторыі і фартыфікацыі:

— Сотні тысяч беларусаў былі прызваны ў Рускую імператарскую армію. Многія з іх загінулі. Іх трэба памятаць, шанаваць, даглядаць іх магілы, здымаць пра герояў фільмы.

Часта ўзнікае пытанне: а як ставіцца да змешаных могілак і чужых пахаванняў наогул? І тут галоўнае разумець, што нам не трэба прымаць нічый бок, трэба проста шанаваць памяць загінулых — незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці. Гэта была бітва народаў. Тым больш некаторыя ваявалі з двух бакоў: напрыклад, чэхі і палякі.

Раскол у Еўропе пачаўся якраз у гады Першай сусветнай вайны. Аднак яна скончылася. Вялікую Айчынную вайну як складнік Другой сусветнай дараваць немагчыма: на нас напалі, нас хацелі знішчыць як нацыю. Ды і ў гэтай сітуацыі сучаснае нямецкае пакаленне ні ў чым перад намі не вінавата. Трэба перастаць варожа ставіцца да людзей, продкі якіх раней ваявалі з намі. Вядома, у першую чаргу, шанаваць трэба сваіх. Аднак трэба разумець, што канец вайны — прымірэнне ўсіх ваюючых народаў. І каб гэтага больш не паўтарылася, неабходна шанаваць памяць усіх.

МЕМАРЫЯЛІЗАЦЫЯ

Уладзімір БАГДАНАЎ, фатограф, спецыяліст па воінскіх пахаваннях Першай сусветнай вайны ў Беларусі:



— Вяртаючыся да тэмы стаўлення да нямецкіх пахаванняў і пахаванняў, трэба ўзгадаць хаця б тое, што многія прозвішчы на помніках нашым суайчыннікам мы чытаем на нямецкай мове. Помнікі рускім героям вельмі часта можна сустрэць і на нямецкіх могілках. Гэта гаворыць пра паважлівае стаўленне да праціўніка. Нават у Снове, што пад Нясвіжам, існуюць рускія могілкі, цалкам зробленыя за грошы немцаў, выдзеленыя ў 1930-х гадах мінулага стагоддзя. Таму дзяліць гэтыя пахаванні на «нашы» і «не нашы» папросту амаральна.

Што тычыцца прагматычнага боку сітуацыі, на ўліку ў Міністэрстве абароны значыцца 137 пахаванняў Першай сусветнай вайны. Я іх налічыў амаль 300. І тут размова ідзе нават не пра тое, каб іх аднавіць, а хаця б неяк абазначыць. Магчыма, праблему мемарыялізацыі трэба вырашаць нават не на вялікім узроўні, а на ўзроўні абазначэння гэтага месца, надання яму пэўнага сакральнага значэння. Няхай гэта будзе нейкі маленькі тыпавы знак воінскага пахавання.

Каб дабрацца да рэалізацыі абазначэння гэтых месцаў, сёння не хапае ўзаемадзеяння паміж мясцовымі органамі ўлады і пошукавым батальёнам. Калі мы гаворым пра тое, што гэтыя месцы трэба прывесці ў парадак, каб яны мелі годны выгляд, то, магчыма, патрэбна нават мяняць пэўны падыход з боку ўпраўлення па ўвекавечванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Сёння мала знайсці месца пахавання, падняць гэтыя астанкі. Трэба надаць гэтаму месцу адпаведны выгляд.

ІНІЦЫЯТЫВЫ

Аляксандр САМОВІЧ, член Геральдычнай рады пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

— Трэба мець на ўвазе адзін аспект: 100-годдзе пачатку Першай сусветнай вайны будзе праходзіць паралельна з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і адкрыццём музея Вялікай Айчыннай вайны. Абсалютна навідавоку, што асноўныя сілы і сродкі дзяржавы будуць накіраваны на апошнія два знакавыя мерапрыемствы, сведкі якіх яшчэ жывыя. Гэтыя падзеі прымусяць нас падпарадкавацца хвалі мерапрыемстваў, прысвечаных Вялікай Айчыннай вайне.

Аднак выключаць нашу працу таксама нельга. Спадзявацца на тое, што шмат хто нам будзе дапамагаць рэаніміраваць падзеі 100-гадовай даўніны, таксама не варта. Я думаю, што кожны з нас у наш імправізаваны арганізацыйны камітэт падасць свае прапановы.

Ужо існуе шмат слушных прапаноў па памятным знаку. І трэба пачынаць працу ў гэтым кірунку як мага хутчэй: ізаграфію гэтага знака, безумоўна, мы здольны распрацаваць. Трэба імкнуцца да таго, каб пошук мемарыяльнага месца выглядаў менш працаёмкай задачай, чым яго ўвекавечванне.

Я заклікаю нас быць разважлівымі людзьмі: праблем вельмі шмат. Ставіць іх ужо зараз трэба перад усімі ведамствамі. І людзі даведаюцца, што грамадства жыве не толькі інтарэсамі Другой сусветнай вайны, а і справядліва задаецца гістарычнай памяццю 100-гадовай даўніны. Мы ведаем, што грамадская свядомасць будзе ісці наперадзе. На фоне гэтых юбілеяў давядзецца сустрэць і псіхалагічную непадрыхтаванасць насельніцтва. Таму мы не павінны дзейнічаць імпульсіўна і фрагментарна, а мэтанакіравана, улічваючы ўсе гэтыя нюансы.

Акрамя прапаноў, ужо ёсць пэўныя напрацоўкі ў гэтай тэме. У выдавецкім доме «Звязда» будзе зроблена першая спроба абагульніць біяграфіі георгіеўскіх кавалераў — ураджэнцаў беларускіх зямель: ніжэйшых чыноў, малодшых афіцэраў, генералаў. Гэта ўсяго толькі сціплая спроба: тыя, хто займаліся гэтай справай, ведаюць, што на паверхні гэтыя імёны не ляжаць, да іх даводзіцца даходзіць доўгім і працаёмкім шляхам. У выніку атрымаецца своеасаблівы алфавіт георгіеўскіх кавалераў — ураджэнцаў Беларусі. Гэтая спроба адкрые новыя імёны тых, хто яшчэ захаваў памяць пра сваіх продкаў. Усё ў нас атрымаецца ў той абстаноўцы, у якой мы знаходзімся: іншых умоў нам ніхто не прапануе.

МІЖНАРОДНЫ ХАРАКТАР

Андрэй ШУПЛЯК, намеснік начальніка ўпраўлення знешнепалітычнага аналізу Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь:

— Мерапрыемствам, прысвечаным падзеям Першай сусветнай вайны, якія будуць праводзіцца ў нашай краіне, трэба надаць міжнароднае гучанне і міжнародны фармат. З аднаго боку, мы павінны і можам паказаць тое, што мы памятаем і шануем нашу гісторыю. А з іншага боку, гэта цудоўная магчымасць для нас папрацаваць з замежнымі калегамі. А магчыма, нават знайсці такіх людзей, якія гэтай тэмай цікавяцца і з задавальненнем прынялі б удзел у будучых мерапрыемствах. Гэта ўнікальная магчымасць і паказаць нас за мяжой, што вельмі важна.

Вядома, не трэба арганізоўваць усё гэта для іншых. Давайце ўсё зробім для сябе. Міністэрства замежных спраў праз свае замежныя ўстановы гатова аказаць і, безумоўна, акажа неабходную падтрымку па ўсталяванні кантактаў, пошуку зацікаўленых асоб, ажыццяўленні перадачы запрашэнняў.

КУЛЬТУРНЫ АСПЕКТ

Аляксандр СУША, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці:

— Першая сусветная вайна — не канец перыяду і нават не пачатак новага. Гэта апагей той эпохі, пік у беларускай культуры. Больш за тое, вайна — найярчэйшы этап тагачаснага культурнага перыяду. Пра гэта можна меркаваць на падставе багатай культурнай спадчыны, якая нам засталася. Многія дзеячы культуры лёсам звязаны з Першай сусветнай вайной.

Мы не павінны займацца гераізацыяй мінулай вайны. У гэтым кантэксце трэба казаць пра лёс культурнай спадчыны. Вайна стала аб'ектам мастацтва, літаратурнай творчасці... І менавіта праз культуру можна давесці ўвесь жах той вайны да людзей. У тым ліку, праз культурныя мерапрыемствы, якія трэба будзе ажыццяўляць своечасова.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ПАДЗЕЙ

Дзяніс ТАРАС, кіраўнік Клуба ваенна-гістарычнай рэканструкцыі «Эпоха»:

— У асноўным мы выконваем відовішчную функцыю пры арганізацыі ваенна-гістарычных мерапрыемстваў. Аднак я не згодны з тым, што некаторыя называюць нас уніфармістамі. У мяне на гэты конт крыху спрошчаны падыход. Вядома, я не пайду супраць ісціны, калі скажу, што ваенная форма — не пусты гук. А ў Першай сусветнай вайне форма фактычна з'яўлялася засяроджваннем усіх традыцый папярэдніх пакаленняў. І Першая сусветная вайна стала такой мяжой, калі ваенная форма пачала страчваць дэкаратыўныя функцыі і пачала набываць прыкладное значэнне.

Акрамя таго, форма ваеннага — не толькі рыштунак, а і псіхалагічнае аблічча салдата. Не адкрыю Амерыкі, калі скажу, што вайна — барацьба і чалавечых фактараў. Натуральна, што на баяздольнасць войскаў, яго маральны стан аказвала ўплыў лагістыка, побытавыя ўмовы, падтрымка насельніцтва. Увогуле, армія — злепак, зрэз стану грамадства. Невыпадкова ваенна-гістарычныя клубы імкнуцца цэласна і комплексна данесці да гледачоў гэтых масавых мерапрыемстваў не толькі знешняе аблічча вайскоўцаў, а і паказаць, што вайна — перш за ўсё пот, кроў, бруд. І ўсё гэта на сабе вынеслі афіцэры і звычайныя людзі, уцягнутыя ў сусветную бойню.

У нас наладжаны кантакты з калегамі з блізкага і далёкага замежжа. Таму ёсць магчымасці арганізаваць дастаткова масавыя ваенна-гістарычныя рэканструкцыі, якія, у тым ліку, прызначаны падтрымаць увекавечванне памяці герояў Першай сусветнай вайны.

НЕДАХОПЫ

Андрэй ДАНІЛАЎ, карэспандэнт інфармацыйнага агенцтва «Ваяр» Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь:



— Мне даводзіцца працаваць з гістарычнымі матэрыяламі, якія дасылаюць аўтары. І я ўпэўніўся ў дзвюх сумных тэндэнцыях. Па-першае, маладое пакаленне, якое завяршае тэрміновую ваенную службу, пра Першую сусветную вайну нічога не ведае. Магчыма, усё таму, што школьны курс гісторыі па гэтай тэме вельмі скарочаны. Па-другое, тыя тэксты, якія да нас дасылаюць аўтары, напісаны вельмі навуковай мовай, не суправаджаюцца ніякім ілюстрацыйным матэрыялам. У выніку мы проста не можам публікаваць гэтыя матэрыялы, бо іх не будуць чытаць. Таму я лічу, што калі мы будзем працягваць гэтую тэму ў СМІ, то лагічна заняцца гістарычным лікбезам. Каб гэта было зразумела маладому чалавеку, чалавеку, які дрэнна вывучыў курс школьнай гісторыі, тым, хто ўвогуле не цікавіцца гісторыяй. Таму я вельмі прашу тых, хто будзе супрацоўнічаць са СМІ, выкладаць свае навуковыя артыкулы папулярнай і зразумелай мовай.

ПЛАНЫ

Сяргей МУСІЁНКА, кіраўнік аналітычнага цэнтра ЕсооМ, член рады аналітычнай Асацыяцыі АДКБ:

— На жаль, наша цывілізацыя цяжка хворая — гэта ўжо даўно не сакрэт. Адзін вялікі пісьменнік назваў Першую сусветную вайну першым няўдалым суіцыдам чалавецтва! Многія паказваюць на падабенства эпохі перад Першай сусветнай вайной і нашага часу. Сёння Блізкі Усход — парахавая бочка, нават, магчыма, больш выбуханебяспечная, чым Балканы 1914-га.

Хоць любая гістарычная аналогія недакладная па азначэнні, для нас, безумоўна, важна захаваць гістарычную памяць. Беларусь робіць у гэтым напрамку больш за многія краіны былога СССР. Мы праводзілі канферэнцыі і мерапрыемствы па Першай сусветнай вайне ў 2008, 2011 гадах і сёння атрымалі падтрымку.

28 ліпеня 2014 года мы будзем удзельнічаць у мерапрыемствах і канферэнцыі з нагоды 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны ў Сараева (Боснія і Герцагавіна).

У Мінску ў гэты дзень таксама пройдуць мерапрыемствы ў храме-помніку ў гонар Усіх Святых і ў памяць бязвінна забітых у Айчыне нашай.

Намечана многае: выдавецкія праекты, публікацыі ў прэсе, выставы, здымкі фільмаў, канферэнцыі... Просім усіх, хто не абыякавы да тэмы Першай сусветнай вайны, для якіх гэта гісторыя сям'і, у каго ёсць што сказаць, звяртацца ў газету «Звязда». Будзем разам пісаць гісторыю Першай сусветнай вайны ў Беларусі праз гісторыі людзей!

Падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«НАЧНІКІ» НА ВІЦЕБШЧЫНЕ ЗАЧЫНЕНЫ

З пачатку ліпеня на Віцебшчыне не працуюць начныя крамы. Як канстатавалі ў міліцэйскім ведамстве, амаль што ўсе жыхары дамоў, якія знаходзяцца ля так званых «начнікоў», як і большасць гараджан, задаволены гэтай навіной. Раней людзі выказаліся за закрыццё начных крам.

— У прыватнасці, была закрыта віцебская крама «Дабраном», дзе ў начны час выстройвалася за спіртным чарга да 70 чалавек, парушаўся грамадскі парадак. І толькі за апошні тыдзень працы былі ўчынены тры цяжкія злачынствы: два рабаванні і разбойны напад. Асобы ўсіх парушальнікаў устанавілі, праводзяцца следчыя дзеянні, — адзначыў **Ігар ЯЎСЕЕЎ, начальнік Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама.** — Яшчэ было на Віцебшчыне 6 начных крам: па 2 у Оршы, Наваполацку і Полацку. Рашэннямі кіраўнікоў выканаўчай улады адбылося закрыццё тых «начнікоў». Хаця хачу сказаць, што там у начны час прадавалася спіртное ў падарункавай упакоўцы і коштам больш за 50 тысяч рублёў. Але можна адкрыта сказаць, што пад выглядам гэтых напояў можна было і іншае прадаваць...

Што тычыцца магчымасці купіць спіртное ў начных клубах, яго па-ранейшаму прадаюць.

Міліцыя Віцебшчыны зараз будзе больш увагі надаваць тым, хто, нягледзячы на забарону, распівае піва на вуліцах. Паводле слоў кіраўніка міліцэйскага ўпраўлення, адпаведная прафілактычная праца праводзілася на неналежным узроўні. У дзень толькі ў абласным цэнтры складаецца ад 10 да 30 пратаколаў. Пілі піва нават на прыпынках грамадскага транспарту.

— Папярэджваем, а тых, хто не разумее, прыцягваем да адміністрацыйнай адказнасці. Думаю за 1-2 месяцы гэта дасць вынік, — адзначыў Ігар Яўсееў. — Мы не супраць работы стацыянарных гандлёвых пунктаў, дзе скрыня ёсць, куды можна выкінуць пластыкавы кубак. Трэба піць цывілізавана...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 5 (733)
аддзел рэкламы 287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Кацёл КСТ 12-31 кВт на цвёрдым паліве. Мінск.
Тэл. 8 029 651 11 12.

❒ Карова на выбар, цялушка (ацёл жнівень), 3-пакаёвая кватэра 20 км ад Браслава (танна), пліты ж/б (4,8х1,8 м) — 2 штукі.
Тэл.: 8 029 755 46 43, 8 02153 60 341.

❒ Вокны драўляныя новыя 6 штук, памер 1 м 30 см на 90 см, цана дагаворная.
Тэл. 8 01713 33 438.

❒ Гума да матацыкла ІЖ.
Тэл. 8 01717 499 09.

❒ Драўляны дом, Уздзенскі р-н.
Тэл. 8 029 158 24 68, 8 017 212 24 68.

❒ Кніга народных рэцэптаў лячэння многіх хвароб, у тым ліку і алкагалізму без ведама пітушчага.
Тэл. 8 0212 25 80 79.

❒ «Фальксваген Гольф»-2, шэры металік, 1993 г.в., без важкіх праблем. 1900 у.а. без торгу.
Тэл. 8 029 667 95 31. Дзіма.

❒ Лодка ПВХ новая з Украіны, 2-месная, пад матор. СЛАНІ.
Тэл. 8 029 277 06 17.

❒ Граблі ГВР-3, касілка КС-2,1.
Тэл. 8 01795 98 209.

❒ Малагабарытны магнітафон «Легенда»-404, 1978 г., добра захаваўся.
Тэл. 8 017 247 88 55.

❒ Козлік (узрост 3 мес.).
Тэл. 8 029 766 09 85.

❒ Участак у садовым таварыстве, 10 сотак, з фундаментам 5х6, 35 км ад МКАД у Брэсцкім напрамку, побач прыпынак электрычкі «Клыпаўшчына». Ёсць вада, электрычнасць.
Тэл. 8 029 761 50 10.

❒ Шлюб. сукенка, інд. пашыў, 42—44, рост 163, вельмі танна.
Тэл. 8 029 620 93 35.

МЯНЯЮ

❒ 1-пакаёвую прыватызаваную кватэру ў Віцебску на непрыватыз. кватэру ў Мінску без даплаты.
Тэл. 8 0212 25 80 79.

ПАСЛУГІ

❒ Паходы ў чарніцы, праз тыдзень пасля дажджыкаў у лісічкі, вандроўкі.
Тэл. 8 033 615 75 00.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЫЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

ЛЯСЫ — ПАД ПІЛЬНЫМ КАНТРОЛЕМ

З пачатку сезона нарыхтоўкі другасных лясных рэсурсаў у выніку рэйдавых мерапрыемстваў дзяржаўнай лясной аховы да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 70 парушальнікаў. За парушэнне правілаў пажарнай бяспекі ў лясах да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 172 парушальнікі, за распальванне вогнішчаў у забароненых месцах ляснога фонду — 70, за засмечванне лясоў — 329 парушальнікаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Борисовбытсервис» (продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже одним лотом имущества:

-здание цеха РСУ-1 общей площадью 193,5 кв.м (инв. № 610/С-37698);
-здание цеха РСУ-2 общей площадью 376,0 кв.м (инв. № 610/С-37700).

Имущество расположено на земельном участке площадью 0,1757 га (предоставлен на праве постоянного пользования) с кадастровым номером 640400000002000139, расположенного по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Урицкого, 29.

Начальная цена – 450 000 000 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (45 000 000 бел. руб.), перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на р/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **08.08.2013 в 12:00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.08.2013 до 12:00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

«Частный институт управления и предпринимательства»

с 1 августа по 30 сентября 2013 г. объявляет набор в аспирантуру по специальности 08.00.05 – «Экономика и управление народным хозяйством».

ДОПОЛНИТЕЛЬНАЯ ИНФОРМАЦИЯ:
тел. (017) 263 38 28, +375 44 562 72 10, сайт: www.imb.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Белсвязьстрой» (продавец)

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН

по продаже недвижимого имущества в составе:

здание производственного корпуса, общей площадью 4385.0 кв.м. (инв. № 500/С-32244) на земельном участке с кадастровым номером 500000000004000721 (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования), расположенном по адресу г. Минск, ул. Стебенева, 10 А, площадь земельного участка – 0,6888 га. На земельном участке имеются ограничения (обременения) прав в использовании: охранная зона ливневой канализации площадью 0,1880 га, охранная зона водопровода площадью 0,1827 га. Объект находится в залоге (ипотеке). При переходе к другому лицу права на имущество ипотека сохраняется. Часть указанного недвижимого имущества сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у организатора аукциона).

Начальная цена с НДС – 27 175 600 800 бел. руб.

Задаток 10% от начальной цены (2 717 560 080 бел. руб.) перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 29.05.2013.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **18.07.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.07.2013** до 12.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.

Галоўнае ўпраўленне Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь па г. Мінску
Аддзел па кантрольных паперах
ЗАВЯРАЮ
05 08 2013
Прозвішча _____
Подпіс _____

УТВЕРЖДЕНО
Общим собранием акционеров Открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 5» 21.06.2013 № 10

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

об открытой подписке простых (обыкновенных) акций Открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 5»

Раздел 1. ОБЩИЕ СВЕДЕНИЯ ОБ ЭМИТЕНТЕ

1. Полное и сокращенное наименование эмитента
на белорусском языке:
полное: Адкрытае акцыянернае таварыства «Дарожна-будаўнічы трэст № 5»;
сокращенное: ААТ «ДБТ № 5»;
на русском языке:
полное: Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 5» (в дальнейшем именуемое «Эмитент»);
сокращенное: ОАО «ДСТ № 5».

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес
220090, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Широкая, 26.
Почтовый адрес: 220090, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Широкая, 26; факс/тел. 8-017-281-46-03; электронный адрес – dst5@tut.by.

3. Основные виды деятельности эмитента:
строительство дорог, аэродромов и спортивных сооружений;
распиловка и строгание древесины;
производство столярных изделий;
производство сборных железобетонных и бетонных конструкций и изделий;
производство товарного бетона;
производство асфальтобетона;
производство строительных металлоконструкций;
производство тепловой энергии тепловыми электростанциями, самостоятельными котельными, прочими источниками;
земляные работы;
строительство инженерных сооружений;
прочие строительные работы, требующие специальных профессий;
электромонтажные работы;
столярные и плотничные работы;
теплоснабжение;
монтаж, наладка, ремонт и техническое обслуживание машин и оборудования для добычи полезных ископаемых и строительства;
аренда строительного оборудования.

4. Номера расчетного и/или валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства при проведении открытой подписки на акции
Денежные средства, поступающие при проведении открытой подписки, будут зачисляться на расчетный счет Эмитента № 3012104862014 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369.

5. Наименование периодического печатного издания, в котором будет публиковаться бухгалтерская отчетность эмитента в составе, определенном законодательством, и сроки ее публикации
В газете «Звязда» Эмитент публикует следующую информацию:
годовой отчет Эмитента – не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года;
решение о реорганизации или ликвидации Эмитента – в течение 2-х месяцев с момента принятия такого решения;
о возбуждении в отношении Эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) – в течение 5 дней с момента получения соответствующего судебного постановления;
о внесенных изменениях в Проспект эмиссии акций Открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 5» – в семидневный срок после регистрации указанных изменений в управлении по ценным бумагам Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по г. Минску (далее – регистрирующий орган).

6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента
Депозитарий Эмитента – депозитарий Открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк» (банк зарегистрирован Национальным банком Республики Беларусь 27.10.1995, регистрационный номер 56, код депозитария – 005), расположенный по адресу: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, проспект Дзержинского, 18, действующий на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1089, сроком действия до 29.07.2022).

7. Права и обязанности акционеров
7.1. Акционеры вправе:
участвовать в общем собрании акционеров с правом голоса по вопросам, относящимся к компетенции общего собрания акционеров;
получать часть прибыли Эмитента в виде дивидендов;
получать в случае ликвидации Эмитента часть имущества, оставшегося после расчетов с кредиторами, или его стоимость;
получать информацию о деятельности Эмитента и знакомиться с его документацией в объеме и порядке, определенными уставом Эмитента;
распоряжаться принадлежащими им акциями в порядке, предусмотренном законодательством;
передавать свои полномочия по участию в управлении деятельностью Эмитента иным лицам путем выдачи доверенности либо заключения договора в порядке, установленном законодательными актами.
Решением общего собрания акционеров может быть предоставлено акционерам Эмитента, владеющим простыми голосующими акциями, преимущественное право на приобретение дополнительно выпущенных Эмитентом акций и утвержден порядок реализации такого права.
7.2. Акционеры обязаны:
не разглашать конфиденциальную информацию о деятельности Эмитента;
своевременно сообщать депозитарию, формирующему реестр владельцев ценных бумаг Эмитента, обо всех изменениях данных о себе, включенных в реестр;
выполнять иные обязанности, предусмотренные законодательством.

8. Размер уставного фонда Эмитента – 133 643 409 600 бел. рублей.

9. Количество акций по категориям и типам привилегированных акций, номинальная стоимость акции
Уставный фонд разделен на 14 217 384 простые (обыкновенные) акции в бездокументарной форме номинальной стоимостью 9400 белорусских рублей каждая. Привилегированных акций Эмитент не выпускал.

10. Дата, номер государственной регистрации эмитента и наименование органа, его зарегистрировавшего
Эмитент зарегистрирован решением Минского городского исполнительного комитета от 18.01.2010 в Едином государственном реестре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100219908.

11. Место, время и способ ознакомления с проспектом эмиссии акций
С Проспектом эмиссии простых (обыкновенных) акций Открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 5» можно ознакомиться по адресу, указанному в пункте 2 настоящего документа, ежедневно (в рабочие дни) с 9-00 до 17-00.

12. Решение об увеличении уставного фонда Эмитента путем выпуска дополнительных акций, размещаемых путем проведения открытой подписки, принято Общим собранием акционеров Эмитента 21.06.2013, протокол № 10.

13. Основные цели эмиссии и направления использования средств, полученных в результате проведения открытой подписки на акции
Дополнительный выпуск акций осуществляется с целью привлечения инвестиций для приобретения производственно-технической базы для размещения филиала Дорожно-строительное управление № 12 Эмитента.

14. Планируемый объем эмиссии простых (обыкновенных) акций Эмитента, размещаемых путем открытой подписки, составляет 595 710 акций на сумму 5 599 674 000 белорусских рублей.

15. Количество, категории и типы привилегированных акций, размещаемых путем проведения открытой подписки на акции
Привилегированные акции Эмитентом не выпускаются.

16. Номинальная стоимость акции – 9 400 белорусских рублей.

17. Порядок расчета и выплаты дивидендов по акциям
17.1. Эмитент вправе, за исключением случаев, указанных в подпункте 17.2 настоящего пункта, распределять между акционерами часть прибыли, остающейся в его распоряжении после уплаты налогов и иных обязательных платежей и покрытия убытков текущих периодов, образовавшихся по вине Эмитента, посредством выплаты дивидендов.
Дивиденды выплачиваются только по размещенным акциям как по итогам года (годовые), так и по итогам полугодия, квартала (промежуточные). Общим собранием акционеров устанавливается период, за который выплачиваются дивиденды, а также срок выплаты дивидендов. В случае, если решением общего собрания акционеров срок выплаты дивидендов не определен, он не должен превышать 60 дней со дня принятия решения об объявлении и выплате дивидендов.
Размер дивиденда объявляется в белорусских рублях на одну акцию. Дивиденды выплачиваются в денежных единицах Республики Беларусь, а по решению общего собрания акционеров и с согласия их получателей – в установленном порядке товаром, ценными бумагами или иным имуществом.
Список акционеров, имеющих право на получение дивидендов, составляется на основании данных того же реестра владельцев акций, на основании которого был составлен список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, принявшем решение о выплате соответствующих дивидендов.
Информация о времени и месте выплаты дивидендов доводится до сведения акционеров в том же порядке, в котором они извещаются о проведении общего собрания акционеров. По заявлению акционера причитающиеся ему дивиденды высылаются почтовым переводом или перечисляются на его счет в банке. Расходы по пересылке (перечислению) дивидендов в пределах Республики Беларусь производятся за счет средств Эмитента.
Дивиденды на принадлежащие Республике Беларусь акции за отчетный год перечисляются в республиканский бюджет в сроки, установленные законодательными актами.
17.2. Эмитент не вправе принимать решения об объявлении и выплате дивидендов, а также выплачивать дивиденды, если:
- уставный фонд оплачен не полностью;
- стоимость чистых активов Эмитента меньше суммы его уставного фонда и резервных фондов либо станет меньше их суммы в результате выплаты дивидендов;
- Эмитент имеет устойчивый характер неплатежеспособности в соответствии с законодательством об экономической несостоятельности (банкротстве) или если указанный характер появится у Эмитента в результате выплаты дивидендов;
- не завершен выкуп акций Эмитента по требованию его акционеров.

18. Преимущественное право акционеров, владеющих простыми (обыкновенными) или иными голосующими акциями, на покупку дополнительно выпускаемых акций и сроки реализации этого права
В данном выпуске не предусматривается.

19. Место и время проведения открытой подписки на акции
Открытую подписку на акции проводит Эмитент на внебиржевом рынке по адресу, указанному в пункте 2 настоящего документа, с 9-00 до 17-00 ежедневно (в рабочие дни).

20. Период проведения открытой подписки на акции, а также период сбора эмитентом или по его поручению профучастником предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции
Порядок определения даты начала подписки на акции – первый рабочий день после дня публикации в газете «Звязда» Краткой информации об открытой подписке на акции Эмитента, заверенной в установленном порядке регистрирующим органом.
Порядок определения даты окончания открытой подписки – не позднее шести месяцев после начала открытой подписки.
Проведение открытой подписки на акции осуществляется в два этапа.
На первом этапе Эмитент в течение 7-и календарных дней осуществляет сбор предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести акции в ходе подписки.
На втором этапе Эмитент осуществляет заключение договоров подписки на акции. Эмитент в установленном порядке ведет учет поступивших предложений (заявок) и договоров.

21. Условия досрочного прекращения проведения открытой подписки на акции
Открытая подписка на акции досрочно прекращается, в случае если общее количество акций, указанное в договорах, достигло планируемого объема эмиссии, определенного в пункте 14 настоящего документа.

22. Порядок действий эмитента в случае превышения либо недостижения планируемого объема эмиссии, порядок (условия) заключения договоров в случае если по итогам осуществления эмитентом или по его поручению профучастником сбора предложений (заявок) от лиц, намеревающихся приобрести дополнительно выпускаемые акции, общее количество акций, указанное в поступивших предложениях (заявках), превышает планируемый объем эмиссии
Превышение планируемого объема эмиссии, указанного в пункте 14 настоящего документа, в процессе открытой подписки на простые (обыкновенные) акции Эмитента допускается в случае внесения инвестором неденежного вклада. Сумма, превышающая планируемый объем эмиссии, направляется Эмитентом в резервный фонд Эмитента.
Договор подписки заключается с инвестором, предложившим планируемый объем эмиссии акций. Заключение договоров осуществляется в общей сумме, не превышающей планируемый объем эмиссии акций.

23. Условия отказа от заключения договора
В заключении договора подписки может быть отказано в случаях нарушения условий подписки либо досрочного прекращения подписки в соответствии с пунктом 21 настоящего документа.

24. Основания, по которым открытая подписка (продажа) на акции может быть признана несостоявшейся – в случае отсутствия заключенных договоров подписки на дату окончания подписки.

25. Условия и порядок возврата средств инвесторам при признании открытой подписки (продажи) на акции несостоявшейся либо при запрещении выпуска акций регистрирующим органом.
Средства, полученные Эмитентом при подписке, возвращаются лицам, их перечислившим, в месячный срок с момента принятия Эмитентом решения о признании открытой подписки несостоявшейся либо получения от регистрирующего органа уведомления о запрещении настоящего выпуска акций.

26. Сведения о профессиональном участнике рынка ценных бумаг
В соответствии с действующим законодательством настоящий документ подготовлен Эмитентом с использованием услуг профессионального участника рынка ценных бумаг – Частного дочернего унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» (далее – Частное предприятие «АСБ БРОКЕР») (входит в состав холдинга ОАО «АСБ Беларусбанк»), расположенного по адресу: Республика Беларусь, 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 201, действующего на основании специального разрешения (лицензии) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-12-1135 сроком действия до 23.01.2023.

Генеральный директор
ОАО «ДСТ № 5» В.А. Кириченко

Главный бухгалтер
ОАО «ДСТ № 5» З.К. Чепига

Директор Частного
Предприятия «АСБ БРОКЕР» К.А. Рак

МТБанк

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2013 г.

Наименование банка: ЗАО «МТБанк», г. Минск
в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т поясн. записки	2013 г.	2012 г.
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		228 523,7	164 425,6
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		379 039,1	286 254,3
5	Средства в банках	1104		212 133,0	61 108,2
6	Ценные бумаги	1105		467 906,6	179 167,0
7	Кредиты клиентам	1106		2 772 729,2	1 353 443,8
8	Производные финансовые активы	1107		-	82,0
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		243,9	243,9
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		77 198,3	47 297,2
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		6,1	8,7
12	Прочие активы	1111		72 074,4	44 276,6
13	**ИТОГО активы**	**11**		**4 209 854,3**	**2 136 307,3**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		-	33 210,9
16	Средства банков	1202		626 141,9	369 487,2
17	Средства клиентов	1203		2 991 485,1	1 415 079,2
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		158 198,2	20 912,8
19	Производные финансовые обязательства	1205		-	2,9
20	Прочие обязательства	1206		57 571,7	14 683,4
21	**ВСЕГО обязательства**	**120**		**3 833 396,9**	**1 853 376,4**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		121 857,5	121 857,5
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		17 233,7	12 532,6
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		25 727,4	18 796,7
27	Накопленная прибыль	1215		211 638,8	129 744,1
28	**Всего капитал**	**121**		**376 457,4**	**282 930,9**
29	**ИТОГО обязательства и капитал**	**12**		**4 209 854,3**	**2 136 307,3**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ за 2 квартал 2013 года

Наименование банка: ЗАО «МТБанк», г. Минск
в миллионах белорусских рублей

№ п/п	Наименование статьи	Символ	П-т поясн. записки	2013 г.	2012 г.
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		340 785,7	146 678,7
2	Процентные расходы	2012		273 036,1	97 704,3
3	Чистые процентные доходы	201		67 749,6	48 974,4
4	Комиссионные доходы	2021		199 666,4	87 170,5
5	Комиссионные расходы	2022		22 582,3	7 372,4
6	Чистые комиссионные доходы	202		177 084,1	79 798,1
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		1 744,3	1 424,4
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		21 455,1	18 876,0
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		124,4	533,8
11	Чистые отчисления в резервы	207		36 655,1	16 059,0
12	Прочие доходы	208		24 967,4	6 162,3
13	Операционные расходы	209		130 334,2	69 362,4
14	Прочие расходы	210		23 630,8	9 441,5
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		102 504,8	60 906,1
16	Налог на прибыль	212		12 962,6	4 189,1
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**89 542,2**	**56 717,0**

Руководитель А.К. Жишкевич
Главный бухгалтер В.В. Ермолович
Дата подписания 08.07.2013

Ігуменскі тракт

№ 20 (35)

■ Гарадскія паданні

ТАЯМНІЦЫ ПАДГОРНАЙ

Сёння вуліца Карла Маркса, закрытая для аўтамабільнага руху па выхадных, — адно з любімых месцаў адпачынку мінчан. А як яна выглядала сотню гадоў таму? Разам з экскурсаводам Валянцінай Короткінай мы прайшліся па ёй і прыгадалі часы, калі вуліца яшчэ мела назву Падгорнай.

РОЗНЫЯ ІПАСТАСІ АДНОЙ ВУЛІЦЫ

У 1817 годзе з'явіўся першы план забудовы Менска, на якім былі пазначаны нумарамі кварталы. Дагэтуль з самага ўзнікнення горада ніякай сістэмы ў будаўніцтве не было. Менавіта тады вуліца Падгорная атрымала сваю назву. А раней яе ўчасткі называліся парознаму: вуліца Лошыцкая (вяла да вёскі Лошыца, сёння гэта пешаходны адрэзак Карла Маркса), вуліца Новага рынку... Над назвай асабліва не мудрагелілі: ад узбярэжжа Свіслачы вуліца ўвесь час ідзе ўгору. Падгорная праіснавала да рэвалюцыі 1917 года. Пасля стала вуліцай Свярдлова, і дакладна невядома, да якога часу так называлася: ці то да 1919-га, ці то да 1922 года. У часы нямецкай акупацыі вуліца паспела пабыць Камандантэрштрасэ. А пасля 1922 года яна набыла вельмі пачэсную для савецкіх часоў назву, якую мае і сёння — Карла Маркса.

Планіроўка Падгорнай вуліцы, пазначаная на плане, захоўвалася ў першапачатковым выглядзе ажно да сярэдзіны XX стагоддзя. Вылучалася яна тым, што тут знаходзіліся самыя вялікія шматпавярховікі (калі браць у разлік, што тры паверхі на той час былі вышынным максімумам гарадской забудовы). Першы паверх звычайна быў каменны ці цагляны, а астатнія — драўляныя. Кожны дом меў свой дворык з садам, агародам і гаспадарчымі пабудовамі. Наяўнасць уласнай гаспадаркі на вуліцы Карла Маркса мінчукі ўзгадваюць нават у першым пасляваенным дзесяцігоддзі, а апошнія драўляныя дамы зніклі адсюль на пачатку 1980-х гадоў.

КУТОК МІЛАСЭРНАСЦІ

На рагу сучасных вуліц Валадарскага і Карла Маркса стаіць старадаўні будынак з чырвонай цэглы, упрыгожаны каванымі балконамі. Да рэвалюцыі ў ім месцілася гарадская паліцэйская ўправа, служба вышуку беглых, а яшчэ там знаходзілася арганізацыя, якую б сёння мы назвалі пашпартным сталом. Крыху далей ад управы, на рагу Свярдлова і Карла Маркса (колішніх Каломенскай і Падгорнай), стаяў аднапавярховы домік, у якім размяшчалася Таварыства міласэрнасці Чырвонага Крыжа. У ім менскія дзяўчаткі маглі атрымаць першасную медыцынскую адукацыю і стаць сёстрамі міласэрнасці. Заснаванае па ўказу гарадскога губернатара Мікалая Трубяцкога ў 1903 годзе, Таварыства за першы год свайго існавання выпусціла ў свет 14 сясцёр, якія былі накіраваны на Далёкі Усход і ў Сібір. Там размяшчаліся шпіталі, куды паступалі параненыя з франтоў руска-японскай вайны. Акрамя таго, сёстры міласэрнасці ратавалі і жыхароў Менскай губерні падчас эпідэмій тыфу, халеры і іншых інфекцыйных захворванняў; укамплектоўвалі шпітальныя месцы ў гады Першай сусветнай вайны ў прыфрантавым Менску. Да нашых дзён будынак Таварыства міласэрнасці не захаваўся.

ВА ЎСІМ ВІНАВАТЫ... ЧЭХАЎ!

Ёсць на вуліцы Карла Маркса будынак, адзначаны адразу дзвюма памятнымі шыльдамі. У гэтым доме з 1898 года дзейнічала Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, дзе быў сканцэнтраваны асяродак літаратурнай і тэатральнай культуры горада. Таварыства налічвала чатыры секцыі: мастацкую, драматычную, літаратурную і музычную. Вядома, што адным з сяброў Таварыства (якіх, дарэчы, праз год існавання налічвалася ўжо 400) быў вядомы мастак і педагог Якаў Кругер. Самай актыўнай секцыяй была літаратурная, якая займалася выданнем часопісаў, брашур, улётак; яе ўдзельнікі друкаваліся ў газеце «Северно-Западный край» і праводзілі літаратурныя сустрэчы. Менавіта сябры Таварыства былі ініцыятарамі ўсталявання помнікаў Астроўскаму і Пушкіну ў горадзе. Дарэчы, дзейнасць драматычнага аддзялення распачалася менавіта з п'есы Астроўскага «Беднасць — не загана», пастаўленай у гэтым будынку. Але Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў мела не толькі культурна-асветніцкі напрамак, але і палітычны, што і выклікала пільную ўвагу да арганізацыі з боку гарадской улады. У 1906 годзе на адну імпрэзу ў Таварыства завітаў гарадскі паліцмайстар. Час гэта быў неспакойны (адбылася рэвалюцыя 1905 года), і ахоўніку правапарадку «пашчасціла» зайсці менавіта тады, калі ўся зала скандзіравала «Далоў самадзяржаўе!». Але, як узгадвалі пасля сябры Таварыства, гэта быў зусім не палітычны мітынг, проста аўдыторыя была настолькі ўзрушана чытаннем і абмеркаваннем твораў Чэхава. Ці так гэта было насамрэч, меркаваць складана, толькі пасля гэтай падзеі дзейнасць Таварыства забаранілі.

Але літаральна праз некалькі месяцаў арганізатары Таварыства прыгожых мастацтваў адкрылі Літаратурнае таварыства, што пацвярджае адна з шыльдаў на будынку. Але і гэтая суполка доўга не праіснавала, бо мела палітычную афарбоўку. За савецкім часам гэты будынак стаў гісторыка-культурнай каштоўнасцю, пра што сведчыць яшчэ адна шыльда на ім.

ЗА СЦЕНАМІ МУЗЕЙНАГА БУДЫНКА

Пасля пракладання чыгункі Менск стаў буйным гандлёвым цэнтрам, тут актыўна разгарнулася будаўніцтва (а дагэтуль горад хоць і меў статус губернскага, але насамрэч «не дацягваў» да яго). І вось нарэшце тут з'явіўся фінансавы цэнтр, які размяшчаўся якраз на Падгорнай вуліцы: спачатку ў доме, што стаяў на месцы сённяшняга Нацыянальнага гістарычнага музея, а з 1903 года — менавіта ў гэтым самым будынку, бо першапачаткова ён узводзіўся як аддзяленне Дзяржаўнага банка. За некалькі кварталаў ад яго, на месцы сучаснага кінатэатра «Цэнтральны», размяшчалася лясная біржа, і ўсе грошы ад лясного гандлю сцякаліся ў банк на Падгорнай. У 1899 годзе гэты банк быў адным з пяці лепшых на тэрыторыі ўсёй Расійскай імперыі і самым лепшым на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю. Праіснавала гэтая ўстанова да 1917 года. Але і з прыходам савецкай улады «традыцыя» не знікла: тут размясціўся наркамат фінансаў (апроч яго, да вайны тут знаходзіліся ЦК КПБ і ЦК камсамола). А пазней будынак заняла рэдакцыя «касмаполітэна» савецкага часу — самага вядомага жаночага часопіса на ўсёй савецкай прасторы «Работніца і сялянка». З 1967 года будынак аддалі пад Дзяржаўны гістарычны музей БССР.

ЯК НА ПАДГОРНУЮ ПРЫЙШЛА ЦЫВІЛІЗАЦЫЯ

Сёння вуліца Карла Маркса добраўпарадкавана, але такой яна стала не так даўно ў параўнанні з яе агульным «узростам». Досыць доўга тут не было брукаванкі, і кажуць, што з'явілася яна ў выніку аднаго кур'ёзнага і разам з тым непрыемнага выпадку. Доўгі час гараджане расказвалі, што аднойчы праз гэтую вуліцу перавозілі бочку з асінезатарскай вадкасцю. Не вытрымаўшы купінаў Падгорнай вуліцы, бочка ўпала, і ўсё, што было ў ёй, вылілася проста на дарогу. Гэтае здарэнне і стала нагодай для брукавання вуліцы. А тратуары з'явіліся тут толькі на пачатку XX стагоддзя. У пасляваенны час брукаванка на вуліцы Карла Маркса знікла пад асфальтавым пакрыццём.

Асвятленне вуліцы таксама з'явілася параўнальна нядаўна. Яшчэ напрыканцы XIX стагоддзя Падгорная асвятлялася толькі газавымі ліхтарамі, якія месціліся па яе баках, і тое не на ўсіх участках. Электрычнасць на вуліцы Падгорнай з'явілася ў 1895 годзе, але таксама не паўсюль: на перасячэннях з вуліцамі Губернатарскай, Петрапаўлаўскай і Багадзельнай (сучасных Леніна, Энгельса і Камсамольскай) электрычнага асвятлення на пачатку XX стагоддзя яшчэ не было. Электрыфікацыя адбылася дзякуючы гарадскому галаве Каралю Чапскаму, палац якога знаходзіўся на Падгорнай. Дарэчы, вуліца вяла да Губернатарскага саду (сучасны парк Горкага), дзе, на месцы сённяшняй актыўнай будоўлі, зусім нядаўна яшчэ стаяла першая мінская электрастанцыя.

ПРЫВІДЫ МІНУЛЫХ ЧАСОЎ

Шматлікія праявы жыцця Падгорнай вуліцы засталіся цяпер толькі ў летапісе горада. Як, напрыклад, яўрэйскі малітоўны дом, што знаходзіўся побач з банкам. На канец XIX стагоддзя ў Мінску налічвалася каля 90 сінагог і малітоўных дамоў. Тут жа непадалёк былі адны з самых буйных яўрэйскіх могілак, якія часткова зруйнавалі пры будаўніцтве стадыёна «Дынама».

А на на месцы сённяшняга двара дома №17 па Карла Маркса раней быў завулак, які меў назву Захар'еўскі (бо злучаў вуліцы Падгорную і Захар'еўскую — сучасны праспект Незалежнасці). У Захар'еўскім завулку месцілася адна з самых вядомых каўбасных крам. Тут жа знаходзіўся і каўбасны склад, бакалейныя крамкі, у раёне колішняй паліцэйскай управы была тытунёвая крама. У 50-я гады XX стагоддзя падчас перабудовы завулак знік, бо вуліца моцна пацярпела ў гады вайны.

У раёне сучасных дамоў №№23, 25 размяшчаўся адзін з цэнтраў сярэдняй адукацыі канца XIX стагоддзя — Дом паляка, які пазней быў перайменаваны ў вышэйшую пачатковую школу, дзе маглі вучыцца як хлопчыкі, так і дзяўчынкі. Плата за навучанне тут была невялікая, складала 10 рублёў за год, а за дадатковую плату можна было вывучаць яшчэ і замежныя мовы. Сюды Дом паляка перамясціўся з уласнага будынка ў раёне сучаснага сквера Міцкевіча пасля таго, як там здарыўся пажар. Таксама недалёка адсюль стаяла яшчэ адна даволі вядомая ўстанова адукацыі — жаночая Марыінская гімназія. Дзяўчаты-гімназісткі ладзілі на вуліцы Падгорнай свята — Дзень белай кветкі. Вучаніцы прыбіраліся, замацоўвалі на адзенні белыя кветкі, садзіліся ў павозкі, таксама ўпрыгожаныя белай тканінай і кветкамі, і за сімвалічную плату прадавалі, зразумела, белыя кветкі — ружы і язмін. Грошы ад продажу ішлі на дабрачыннасць.

І праўда, трэба паспрабаваць як-небудзь прагуляцца па Карла Маркса з белымі кветкамі. Раптам атрымаецца адчуць дух Падгорнай?..

Дзіяна СЕРАДЗЮК.
Фота аўтара

■ Скрыжалі гісторыі

ВОЛЬГА, АЛЬГЕРД, АЛЯКСАНДР: ШТО ІХ ЯДНАЕ?

У Віцебску плануюць паставіць помнікі кіеўскай княгіні Вользе, князю віцебскаму, вялікаму князю літоўскаму і рускаму Альгерду і славутаму рускаму князю Аляксандру Неўскаму. Аднак узнікла шмат спрэчак, ці вартая кожная з гэтых асобаў таго, каб быць увекавечанай у выглядзе помніка паблізу ратушы — сімвала горада. Карэспандэнт «Звязды» звярнуўся па каментарый да спецыялістаў, выкладчыкаў гісторыі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.

ЦІ БЫЛА ТУТ ВОЛЬГА?

— Апошнім часам у сеціве разгарнуліся ажыўленыя дыскусіі пра ролю княгіні Вольгі ў гісторыі Віцебска, звязаныя з ініцыятывай устаноўкі помніка легендарнай заснавальніцы горада і прысутнасці яе асобы ў тэксце зацверджанага нядаўна гарадскога гімна. Даволі распаўсюджана думка, што паданне — нічым не пацверджаны міф, бо згадка захавалася ў позніх Віцебскім летапісе (Dzieje miasta Witebska) XVIII стагоддзя і змяшчае шэраг недакладнасцяў. Але ці ўсё тут адназначна? — распавядае **Анатоль Дулаў, загадчык кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.** — Паданне пра заснаванне Віцебска княгіняй Вольгай пачынала Віцебскі летапіс і служыла пунктам адліку гісторыі горада: *«У год 974 Вольга, пабіўшы яцвягаў і печанегаў, пераправілася з ваярамі цераз раку Дзвіну і заначавала, а ўпадабаўшы гару, заклала драўляны замак, які назвала ад ракі Віцьбы Віцебскам. У Верхнім замку змуравала царкву святога Міхала, а ў Ніжнім — Звеставанне. Два гады тут пражыўшы, ад'ехала да Кіева»*.

Гэты тэкст сапраўды мае шэраг неадпаведнасцяў, на што звярталі ўвагу вучоныя, пачынаючы з выдатнага даследчыка віцебскай мінуўшчыны Аляксея Сапунова, які першым апублікаваў тэкст летапісу ў 1883 годзе ў першым томе зборніка «Витебская старина». Так, у 974 годзе Вольгі ўжо не было сярод жывых (памерла ў 969-м). Недакладныя і зместкі пра яе прыбыццё на месца будучага горада пасля перамогі над яцвягамі і печанегамі, бо шлях княгіні ў любым выпадку не мог ісці праз Віцебск. Да таго ж Русь яшчэ не стала хрысціянскай, традыцыі мураванага дойлідства адсутнічалі. Замкі з'явіліся ў Віцебску значна пазней. Падобныя факты могуць указваць на тое, што паданне — пазнейшая прыдумка. Але не толькі! Недакладнасці, магчыма, сведчаць пра працяглае бытаванне падання пра заснаванне Віцебска княгіняй Вольгай у вуснай форме перад тым, як яно было запісана.

Сам жа факт наведвання княгіняй паселішча крывічоў у сутоцы Дзвіны і Віцьбы можна датаваць прыкладна 947 годам, пад якім у «Аповесці мінулых часоў» згаданы паход княгіні на поўнач, да Ноўгарада, з мэтай вызначэння пагостаў (цэнтраў збору даніны). Пра гэта пісалі яшчэ на пачатку 1970-х гг., напярэдадні святкавання тысячагоддзя Віцебска, буйныя спецыялісты па гісторыі Старажытнай Русі Барыс Рыбакоў і Леанід Аляксееў.

Дзяніс Юрчак, намеснік дэкана гістарычнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава, лічыць, што княгіня Вольга заслугоўвае таго, каб быць увекавечанай на вуліцах старажытнага Віцебска: «Зразумела, што Вольгу нельга лічыць менавіта заснавальніцай горада. Пасяленне балтаў існавала на месцы ўпадзення Віцьбы ў Дзвіну яшчэ з часоў ранняга жалезнага веку. Потым тут з'явіліся славяне. Факт наведвання Вольгай Віцебска сапраўды мог мець месца ў 947 г., што садзейнічала ператварэнню паселішча ў горад — эканамічны і адміністрацыйны цэнтр на землях крывічоў. На карысць гэтага сведчыць перадача Віцебска ў 1021 годзе кіеўскім князем Яраславам Мудрым свайму пляменніку Брачыславу, князю полацкаму, пасля знакамітай бітвы на рацэ Судамір».

Фота Анатоля КПЕШЧУКА.

Помнік плануюць паставіць побач з ратушай.

Не адмаўляе магчымасць наведвання племяннога цэнтра віцебскага адгалінавання крывічоў — Віцебска — княгіняй Вольгай і **археолаг, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Таццяна Бубенька.** Пры гэтым, кажа Таццяна Станіславаўна, вынікі археалагічных даследаванняў сведчаць, што раннефеадальны горад Віцебск стаў складвацца на аснове паселішча крывічоў на мяжы X—XI стагоддзяў. А гэта можна лічыць ускосным пацвярджэннем летапіснай легенды.

АЛЬГЕРДА НА ПАСТАМЕНТ?

Дзяніс Юрчак, разважаючы, ці заслугоўвае Альгерд помніка ў нашым горадзе, сказаў:

— Праўду трэба шукаць, не кідаючыся ў крайнасці, на аснове ўважлівага вывучэння ўсіх наяўных крыніц. Бацькам Альгерда, князя крэўскага і віцебскага, вялікага князя літоўскага (1345—1377), быў вялікі князь літоўскі Гедымін (1316—1341), пры якім Вільня стала прэтэндаваць на ролю цэнтра збірання земляў былой Кіеўскай Русі. Цалкам верагодна, што ў жылах Альгерда цякла і славянская кроў: на думку некаторых гісторыкаў, маці яго была полацкай князёўнай. У такім выпадку з дзяцінства асоба князя фарміравалася пад уплывам культурных і рэлігійных традыцый Русі.

У 1318 годзе Альгерд заключыў шлюб з князёўнай Марыяй, дачкой апошняга віцебскага князя з Рурыкавічаў — Яраслава. У позніх летапісных крыніцах сказана, што Альгерд ахрысціўся напярэдадні шлюбу з Марыяй Яраслаўнай, — расказвае спадар Юрчак. — Праз два гады князь Яраслаў памёр, не пакінуўшы сыноў. Віцебскае княства адышло па спадчыне яго зяцю Альгерду. Гэта пацвярджае, што Альгерд ужо быў ахрышчаны па ўсходнім абрадзе, у адваротным выпадку яго б не прынялі мясцовыя жыхары. Ёсць і непасрэдныя сведчанні дакументальных крыніц аб праваслаўным веравызнанні Альгерда. Так, дамова ВКЛ з Лівонскім ордэнам «1338» замацоўвалася клятвай літоўцаў-язычнікаў на сваіх святынях і крыжацалаванням праваслаўных князёў. Сярод апошніх названы і князь віцебскі. Калі пскавічы прапанавалі Альгерду стаць іх князем, а дзеля гэтага хрысціцца, атрымалі адказ, што ён ужо хрысціянін...

— Князь шмат зрабіў для Віцебска, — працягвае **Таццяна Бубенька.** — Менавіта ў перыяд княжання Альгерда ў Віцебску былі збудаваны каменныя Верхні (з княжацкімі палатамі) і Ніжні замкі агульнай працягласцю сцен каля двух кіламетраў. Будаўніцтва замкаў магло пачацца каля 1330 года, а завершана было, як сведчыць «Хроніка Літоўская і Жамойцкая», у 1351 годзе другой жонкай Альгерда, дачкой цвярскога князя Аляксандра Міхайлавіча — Ульянай. Віцебскі замак стаў адным з наймагутнейшых на тэрыторыі Усходняй Еўропы і быў уключаны ў «Спіс гарадоў рускіх дальніх і бліжніх» (канец XIV—XV ст.).

Таму найбольш мэтазгодна помнік Альгерду ставіць паблізу ад рэштак Вуглавой вежы ім жа збудаванага замка. Але чамусьці прапануюць паставіць помнік у вельмі нязручным месцы, якое падчас жыцця князя нават горадам не было. Да таго ж узнікае пытанне: у які бок павярнуць постаць князя? У выбраным месцы ёсць толькі адзінае магчымае рашэнне: тварам да Масквы. І ў гэтым некаторыя і могуць убачыць «антырасійскую скіраванасць».

Што датычыцца сцвярджэння, што Альгерд не быў праваслаўным, то нагадаю, што менавіта ён пабудаваў прытворы да Дабравешчанскай царквы XII ст. у Віцебску, спрыяў існаванню праваслаўнай мітраполіі ў Наваградку. Наогул для дзяржавы Альгерд зрабіў шмат. Заслугі яго прызнавалі нават у Расіі, нягледзячы на тры паходы на Маскву! Постаць князя ўшанавана на мануменце «Тысячагоддзе Расіі», усталяваным у 1862 годзе ў Ноўгарадзе.

Сярэднявечча, наогул, жорсткі час, час крывавых міжусобіц. Таму наўрад ці ёсць у тагачаснай гісторыі палітычны дзеяч, які не праліў бы крыві ворагаў, часам нават адзінаверцаў. Аднак гэта не перашкаджае нашчадкам ушаноўваць іх заслугі.

— Альгерд пашыраў межы ВКЛ за кошт усходнеславянскіх зямель, — кажа Анатоль Дулаў. — Далучыў частку Смаленскай зямлі, Чарнігава-Северскага княства. На гэтым напрамку князю давялося сутыкнуцца з мангола-татарамі. У 1362 годзе яго войска, якое складалася, галоўным чынам, з усходніх славян, разбіла ў бітве каля Сініх Вод (рака Сінюха) трох татарскіх ханаў. Дзякуючы гэтаму ўкраінскія землі са сталіцай Старажытнарускай дзяржавы Кіевам апынуліся ў складзе ВКЛ. Быў пакладзены пачатак вызваленню ўсходнеславянскіх зямель ад ардынскага прыгнёту. Князь змагаўся з Польшчай за Валынь і Галіцкую зямлю. Разам з братам Кейстутам Альгерд паспяхова супрацьстаяў крыжацкаму «Drang nach Osten» («націску на Усход»).

— Пры Альгердзе ўзмацніўся ўсходнеславянскі ўплыў у палітычнай, культурнай, духоўнай сферах Вялікага Княства Літоўскага і Рускага, — дадае **Дзяніс Юрчак.** — Гэта падкрэсліваліяшчэ дарэвалюцыйныя гісторыкі. У прыватнасці, самы яскравы прадстаўнік заходнерускай школы Міхаіл Каяловіч у дачыненні да перыяду вялікага княжання Альгерда нават выкарыстаў паняцце «праваслаўнае перастварэнне Літвы». У сталіцы ВКЛ Вільні з'явіліся першыя праваслаўныя храмы: св. Мікалая, Пятніцкая і Прачысценская цэрквы. Князь імкнуўся аднавіць (і аднавіў) асобную праваслаўную мітраполію для сваёй дзяржавы (Кіеўскі мітрапаліт знаходзіўся ў Маскве). Праўда, гэта было выклікана, хутчэй палітычнымі прычынамі.

Выклікае сумненне вераадступніцтва Альгерда, вяртанне яго ў язычніцтва ў перыяд вялікага княжання. Князю важна было ўзмацніць свой уплыў на далучаных усходнеславянскіх землях, а для гэтага трэба было быць праваслаўным. Сапраўды, ордэнскі хроніст Герман Вартберг паведамляе, што пахаванне Альгерда суправаджалася язычніцкімі абрадамі: «Пры яго пахаванні, згодна з літоўскім паганскім абрадам, было здзейснена ўрачыстае шэсце са спаленнем розных рэчаў і 18 баявых коней». Гэта і зразумела: у апошні шлях князя праводзілі і балцкія арыстакраты-язычнікі. Да таго ж крыжакі былі зацікаўлены прадставіць ВКЛ апорай язычніцтва, каб працягваць перманентны крыжовы паход на балцкія і славянскія землі. Па іншай версіі, Альгерд памёр не проста хрысціянінам, але нават стаў манахам і прыняў схіму. У выніку князь быў нават занесены ў памяннік Кіева-Пячэрскай лаўры...

Анатоль Дулаў дадаў, што князь Альгерд пакінуў шмат нашчадкаў — 12 сыноў і 9 дачок. Сыны Альгерда былі праваслаўнымі (толькі ў 1386 годзе, пасля Крэўскай уніі з Польшчай, некаторыя з іх перайшлі ў каталіцтва). Альгердавічы адыгрывалі значную ролю ў палітычным жыцці ВКЛ і суседніх зямель. Напрыклад, Андрэй (старэйшы сын) і Дзмітрый Альгердавічы ўнеслі важкі ўклад у перамогу маскоўскага князя Дзмітрыя Іванавіча над ардынцамі на Куліковым полі 8 верасня 1380 г. А старэйшы сын ад Ульяны Цвярской Ягайла (у праваслаўі Якаў) стаў каралём польскім Уладзіславам II, заснавальнікам дынастыі Ягелонаў, прадстаўнікі якой займалі пасады ў Польшчы, Венгрыі і Чэхіі...

— За час княжання Альгерда тэрыторыя Вялікага Княства Літоўскага і Рускага пашырылася больш чым у два разы, беларускія землі занялі ў дзяржаве цэнтральнае становішча. Гэта спрыяла развіццю іх эканомікі і культуры, умацаванню статусу «рускай» (старабеларускай) мовы як афіцыйнай, пашырэнню ўплыву ў княстве праваслаўнай царквы, — кажа **Дзяніс Юрчак.** — Альгерд унёс значны ўклад у развіццё Віцебска, які стаў важным адміністрацыйным цэнтрам і магутнай крэпасцю. Вядома, князь не быў анёлам у плоці, як і любы іншы сярэднявечны манарх. Але ў гісторыі беларускіх зямель, зрэшты, як і ўсходнеславянскіх у цэлым, ён, несумненна, пакінуў яскравы след, пра што сведчыць помнік «Тысячагоддзе Расіі», на якім Альгерд адлюстраваны сярод выдатных дзяржаўных дзеячаў Русі. Думаецца, помнік Альгерду ў нашым горадзе стане годным увекавечаннем дзейнасці князя.

НЕЎСКІ ПРЫЯЗДЖАЎ ПА ЎНУКА?

Мае суразмоўцы расказалі і аб сувязі з Віцебскам князя Аляксандра Яраслаўлча, празванага за перамогу над шведамі на рацэ Няве Неўскім. Адзінае ўпамінанне крыніц аб знаходжанні князя Аляксандра ў горадзе звязана з тым, што ў 1245 годзе ён забраў адсюль сына. Звесткі пра гэта прыведзены ў Наўгародскім першым летапісе. Вядома, летапісная згадка пра тое, што зрабіў князь, неабавязкова сведчыць, што князь здзейсніў гэта і ўласнаручна. Аднак у гэтым выпадку няма падстаў адмаўляць візіту Аляксандра Яраславіча ў Віцебск.

Відавочна, сын князя гасцяваў у свайкоў па матчынай лініі. Справа ў тым, што жонкай Аляксандра была дачка полацкага князя Брачыслава, якую гісторыкі называюць Параскевай, або Аляксандрай. Відавочна, цесць Аляксандра — полацкі князь Брачыслаў, згаданы ў Наўгародскім летапісе, — быў нашчадкам віцебскіх князёў і меў вотчынныя правы таксама і на Віцебск. Аляксей Сапуноў выказаў здагадку, што ў Віцебску жыла аўдавелая да таго часу жонка Брачыслава і хлопчык гасцяваў у бабулі.

Легенда ж пра вянчанне князя ў горадзе над Дзвіной была прыдумана ў другой палове XX ст. адным з віцебскіх экскурсаводаў, які ўвогуле славіўся арыгінальнымі трактоўкамі падзей з гісторыі Віцебска...

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Афіцыйны каментарый

Пётр ПАДГУРСКІ, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама:

— Лічу, што помнік Альгерду павінен быць усталяваны ў Віцебску. Таму што насамрэч гэтая гістарычная асоба шмат зрабіла для станаўлення, фарміравання, развіцця горада ў абаронным, культурным, рэлігійным планах. У тым ліку падчас яго праўлення будаваліся храмы.

Многія чытачы не ведаюць увесь працэс стварэння і ўсталявання помнікаў — гэта займае шмат часу. Напрыклад, вядомы ва ўсім свеце помнік Пятру I у Санкт-Пецярбургу ствараўся 10 гадоў. Знакамітыя скульптуры коней на Анічкавым мосце таксама ў Піцеры — на Неўскім — праспекце таксама з'явіліся не аднахвілінна.

Што тычыцца працэсу ўсталявання помнікаў у нашай краіне, ёсць адпаведнае заканадаўства, якім мы кіруемся. Кіраўнік дзяржавы даў дазвол на стварэнне помніка Альгерду.

Пасля таго як атрымліваецца дазвол Прэзідэнта, робіцца эскіз помніка, які паказваецца для ўзгаднення членам рэспубліканскага савета па манументальным і манументальна-дэкаратыўным мастацтве. Савет узначальвае Міхаіл Баразна, рэктар Беларускай акадэміі мастацтваў. Члены савета — знакамітыя архітэктары, скульптары, мастацтвазнаўцы. Яны адказваюць за тое, каб у выніку быў усталяваны высокамастацкі твор. Эскіз быў узгоднены.

Потым наступны этап: робіцца рабочая мадэль, якая зноў павінна ўзгадняцца ў вышэйназваным савеце. Зараз ёсць заўвагі па рабочай мадэлі і яны выпраўляюцца скульптарам Валерыем Магучым. І пасля ўзгаднення выпраўленняў пачынаецца наступная стадыя стварэння помніка: робіцца ўжо мадэль у натуральную велічыню, але з мяккага матэрыялу — гліны або пластыліну... Як толькі зроблена мадэль, зноў члены савета яе ўзгадняюць. Толькі потым робіцца форма і помнік адліваецца з металу. Зараз этап узгаднення рабочай мадэлі.

Паўтараю, дазвол кіраўніка дзяржавы на ўстаноўку помніка Альгерду ў нас ёсць. Потым было прынята адпаведнае рашэнне Віцебскага гарвыканкама аб стварэнні і ўстаноўцы помніка. Ужо вызначаны заказчык, фінансавыя сродкі — пазабюджэтныя грошы, зароблены гараджанамі падчас суботніка, і грошы ад мецэнатаў.

■ Падзея

На мяжы трох краін

Рэканструкцыя падзей 988 года на славянскіх землях адбывалася падчас міжнароднага моладзевага фестывалю на мяжы трох краін: Беларусі, Украіны і Расіі. 1025-годдзю Хрышчэння Русі прысвяцілі мерапрыемства яго сёлетнія гаспадары-арганізатары — украінскі бок.

У апошні дзень, які традыцыйна збірае не толькі моладзь, але і ўсіх ахвотных з навакольля, на скрыжаванне каля манумента Дружбы прыехала некалькі тысяч чалавек. У тым ліку праваслаўных вернікаў, якія прынялі ўдзел у Боскай Літургіі, што праходзіла на беразе возера.

Дарэчы, як сказаў епіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан, для вернікаў межаў не існуе.

Свае прывітанні шматлікім гасцям і ўдзельнікам фэсту даслалі кіраўнікі Бранскай, Чарнігаўскай і Гомельскай абласцей. У прыватнасці, старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік адзначыў, што гэты форум для жыхароў прыгранічных рэгіёнаў трох краін стаў знакам сяброўства і духоўнай блізкасці.

Абавязковая частка праграмы святочных мерапрыемстваў каля манумента Дружбы, якія сёлета праходзілі 44-ы раз, — работа горада майстроў усіх трох краін. І тут для прыхільнікаў творчасці любых кірункаў было дзе душы разгарнуцца. Шматлікія госці форуму наведалі творчыя пляцоўкі беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх рэгіёнаў, выставы-продажы тавараў народнага спажывання і пачаставаліся прадукцыяй прадпрыемстваў усіх трох дзяржаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара

ДАНТЫСТЫ АДСВЯТКАВАЛІ НАВАСЕЛЛЕ

У Кобрыне адкрылася стаматалагічная паліклініка

Раней зубы лячылі на першым паверсе жылога дома. Там за дзень прымалі да 600 пацыентаў з горада і раёна. Было вельмі цесна і нязручна як медыкам, так і хворым.

Зараз сучасная стаматалагічная паліклініка размяшчаецца на пяці паверхах будынка, які раней належаў заводу аграпрамысловага машынабудавання. На рэканструкцыю памяшкання затрачана 7 мільярдаў рублёў.

Закуплена новае абсталяванне. Аддзяленні (тэрапеўтычнае з хірургічным кабінетам, артапедычнае, дзіцячае і тэрапеўтычнае па аказанні платных паслуг) як след аснашчаны. Калі ў старой паліклініцы працавала адначасова 18 стаматалагічных установак, зараз яны ўстаноўлены на 23 працоўных месцах. У бліжэйшы час будзе закуплена абсталяванне для артапедычнай дапамогі, апаратура для металакерамічных пратэзаў, а таксама дыягнастычная сістэма.

Яна СВЕТАВА.

■ Новыя выданні

СКРОЗЬ «МАЛАДОСЦЬ»!

Не самая сумная кніжка, тая, што абяцала расказаць пра грошы і горкі шакалад, пісьменнікаў і літаратуру, набыла сваё фізічнае аблічча! Выданне можна купіць у кнігарнях краіны або ў офісе Выдавецкага дома «Звязда» на Захарава, 19.

Дарэчы, гэтай кнігай аднаўляецца заснаваная ў 1988 годзе серыя «Бібліятэчка часопіса «Маладосць», што ў юбілейны год даволі сімвалічна.

ТЕХНОБАНК

ОАО «Технобанк»
220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Кропоткина, 44,
Телефон: +375 17 283 15 10

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2013 года

Наименование банка: ОАО «Технобанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01.07.2013	01.07.2012
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		100167,9	52326,8
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		3394,0	145,5
4	Средства в Национальном банке	1103		103969,2	106499,7
5	Средства в банках	1104		98601,1	130126,3
6	Ценные бумаги	1105		130244,8	45172,9
7	Кредиты клиентам	1106		636624,0	517402,0
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		52,1	52,1
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		207079,7	179790,5
